

**Прагрaма тэлебачання на наступны тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**



**Не саромейцеся, што з вёскі…**

СТАР. 6



**«Паветраныя» дамы любяць міні**

СТАР. 8

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

8 жніўня 2014 г. ПЯТНІЦА № 148 (27758) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# ПАТУРАЦЬ БЕСПАКАРАНАСЦІ НЕЛЬГА

**Карэкціроўка крымінальнага і крымінальна-працэсуальнага заканадаўства не павінна ствараць умовы для ўхілення ад адказнасці**

Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на нарадзе па праекце закона, які прадугледжвае комплексную карэкціроўку крымінальнага і крымінальна-працэсуальнага заканадаўства, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што прынцып непазбежнасці пакарання за ўчыненыя злачынствы павінен заставацца непарушным. «Усе магчымыя змяненні крымінальна-прававых механізмаў могуць так ці інакш развіваць або дапаўняць гэты прынцып, але ні ў якім разе не ствараць умовы для ўхілення злачынцаў ад адказнасці,— адзначыў Аляксандр Лукашэнка.— Патураць беспакаранасці мы не маем ніякага права».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ўжо традыцыйна на ўзроўні Прэзідэнта разглядаюцца найбольш значныя нарматыўна-прававыя акты, адпаведныя дакументы, якія ў значнай ступені ўплываюць або паўплываюць на жыццё людзей і функцыянаванне грамадства. У жніўні мінулага года праект закона абмяркоўваўся. Размова ішла аб прымяненні дасудовага пагаднення аб супрацоўніцтве, укараненні крымінальна-прававой кампенсацыі, выключэнні проціпраўнасці дзеяння пры дзелавой рызыцы. Прапаноўвалася таксама дэкрыміналізаваць асобныя дзеянні, якія не ўяўляюць вялікай грамадскай небяспекі, пашырыць прымяненне штрафу і павялічыць яго памер за эканамічныя злачынствы, унесці шэраг іншых змяненняў.

Па выніках калегіяльнага абмеркавання было прызнана — законапраект з'яўляецца своечасовым і патрэбным для нашай краіны. Пры гэтым Прэзідэнт даручыў дэпутатам сумесна з праваахоўнымі органамі, а таксама з бізнес-супольнасцю дадаткова дэталёва абмеркаваць праект. Пасля прыняць па ўсіх яго палажэннях канчатковае ўзважанае рашэнне, якое ў поўнай меры адпавядае інтарэсам дзяржавы, грамадства і грамадзян.

Аляксандр Лукашэнка асабліва папярэдзіў: «Магчымыя карэкціроўкі крымінальнага закона не павінны прыводзіць да выпустошвання самой сутнасці закона. Пры любых змяненнях яго нормы павінны захоўваць неабходны прафілактычны эфект і адначасова мець належнае карнае ўздзеянне на парушальніка, калі злачынства пазбегнуць усё ж не ўдалося, калі прафілактыка ў тым ліку не спрацавала».

На думку кіраўніка дзяржавы, не менш важная і належная арганізацыя крымінальнага працэсу. «Расследаванні, якія доўжацца працяглы час без асаблівых вынікаў, не павінны ўспрымацца як нешта звычайнае і нармальнае,— запатрабаваў Прэзідэнт.— Пракурор, следства і суд абавязаны мець у сваім арсенале такія сучасныя прававыя інструменты, якія могуць забяспечыць аператыўнае і аб'ектыўнае расследаванне і разгляд крымінальных спраў».

СТАР. 2

# ПАД ПІЛЬНЫМ ВОКАМ





**Спякотнае надвор'е, якое пануе ў краіне ўжо не першы тыдзень, прыводзіць да пажараў у лясных масівах і на тарфяніках. Каб мінімізаваць магчымы ўрон ад агню, спецыялісты дзяржаўнага прадпрыемства «Беллесавія» штодня патрулююць тэрыторыю з паветра. Каб праінспектаваць сітуацыю на месцы, у палёт адправіўся і першы намеснік начальніка Віцебскага абласнога ўпраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Алік ГАНЧАРОЎ.**

Фота БЕЛТА.

*ЛІЧБА ДНЯ*

## $13,4 млрд,

***або 18,3% ВУП, складаў на 1 ліпеня 2014 года знешні дзярждоўг Беларусі, паведамляе Міністэрства фінансаў. Памер знешняга дзяржаўнага доўгу, плацяжы па яго абслугоўванні і пагашэнні не перавышаюць парогавых значэнняў паказчыкаў эканамічнай бяспекі, які складае 25%. Плацяжы па пагашэнні і абслугоўванні знешняга дзяржаўнага доўгу склалі 8,2% да валютнай выручкі (пры парогавым значэнні 10%). Унутраны дзяржаўны доўг на 1 ліпеня склаў Br40,1 трлн, або 5,5% да ВУП (парогавае значэнне 20%).***

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | +30° |
| Віцебск | +30° |
| Гомель | +31° |
| Гродна | +28° |
| Магілёў | +30° |
| Мінск | +30° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 08.08.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10350,00 | ▲ |
| Еўра | 13850,00 | ■ |
| Рас. руб. | 286,00 | ▼ |
| Укр. грыўня | 828,00 | ▼ |

# ПОЎНАЯ ПРАЗРЫСТАСЦЬ У АДНОСІНАХ

Прэзідэнты Беларусі і Расіі абмеркавалі ў тэлефоннай размове супрацоўніцтва ў ЕАЭС і меры расійскага боку па забеспячэнні сваёй эканамічнай бяспекі

**7 жніўня па ініцыятыве расійскага боку адбылася тэлефонная размова Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі з Прэзідэнтам Расійскай Федэрацыі Уладзімірам Пуціным. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Прэзідэнт Расіі праінфармаваў Аляксандра Лукашэнку аб эканамічных мерах, прынятых Расіяй адносна шэрагу катэгорый прадукцыі, што імпартуецца з краін, якія ўвялі санкцыі адносна расійскіх арганізацый і грамадзян. Уладзімір Пуцін выказаў надзею, што Беларусь з разуменнем паставіцца да такіх крокаў, прынятых у інтарэсах эканамічнай бяспекі Расіі.

У сваю чаргу Прэзідэнт Беларусі адзначыў, што на граніцы будзе забяспечана поўная празрыстасць у духу партнёрскіх адносін.

Кіраўнікі дзяржавы абмеркавалі таксама пытанні супрацоўніцтва ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза і яго пашырэння. Была пацверджана пазіцыя аб тым, што далучэнне да яго Арменіі не павінна адбывацца на шкоду інтарэсам Мытнага саюза.

У ходзе размовы Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін абмяняліся меркаваннямі адносна развіцця сітуацыі ў эканоміцы Украіны ў сувязі з падпісаннем ёю Пагаднення аб Асацыяцыі з Еўрапейскім саюзам.

# У НОРМУ

**вернецца надвор'е ў другой палове наступнага тыдня**

Паводле папярэдняга прагнозу, у другой палове наступнага тыдня на тэрыторыі рэспублікі ўсталюецца звычайнае для жніўня надвор'е. «Уначы будзе плюс 10–16 градусаў, днём — ад 20 да 27 цяпла»,— паведаміла карэспандэнту БЕЛТА **галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Людміла ПАРАШЧУК.**

У бліжэйшыя суткі ўмовы надвор'я на тэрыторыі Беларусі прадоўжыць вызначаць цёплая няўстойлівая паветраная маса. Ноччу будзе пераважна без ападкаў, удзень месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы, прагрымяць навальніцы. Тэмпература паветра будзе да 27–32 градусаў цяпла. «На выхадных надвор'е на тэрыторыі рэспублікі абумовіць малаактыўны атмасферны фронт, які марудна перамяшчаецца з тэрыторыі Польшчы»,— сказала прадстаўнік гідраметэацэнтра. Пад яго ўплывам месцамі, пераважна ў заходніх раёнах, пройдуць кароткачасовыя дажджы, прагрымяць навальніцы. Тэмпература паветра ноччу складзе плюс 12–19 градусаў, днём чакаецца ад плюс 24 градусаў па захадзе да 32 цяпла па паўднёвым усходзе краіны.



Фота БЕЛТА.

У аўторак і сераду чакаецца перамяшчэнне на тэрыторыю краіны слабавыяўленых атмасферных франтоў з Заходняй Еўропы. Пад іх уплывам месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы, прагрымяць навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 13–20 градусаў, удзень будзе ад 22 да 28 градусаў.

■ У водпуск

# ЖЫЦЦЁ ПОЎНАЕ СЮРПРЫЗАЎ,

## ТАМУ ЎВАЖЛІВА ЧЫТАЙЦЕ ПРАВІЛЫ СТРАХАВОГА ПОЛІСА!

**Сезон адпачынкаў у разгары. Многія з нас знаходзяцца ў прадчуванні новых уражанняў, сонца, мора і бесклапотнага адпачынку. Але жыццё поўнае сюрпрызаў, і далёка не ўсе яны прыемныя. Нядаўна страхоўшчыкі распавялі журналістам аб розных сітуацыях, у якія траплялі беларускія турысты: хтосьці наступіў на марскога вожыка, камусьці іголка кактуса трапіла ў вока, хтосьці захварэў на ліхаманку Дэнге…**

**Медыцынскія паслугі за мяжой платныя, і нават банальная кансультацыя ўрача з нагоды вывіху нагі зусім не танная. Аб тым, як засцерагчы сябе ад страты грошай у такіх сітуацыях, нам паведаміла начальнік аддзела медыцынскага страхавання філіяла «Белдзяржстраха» па г. Мінску Святланай МЯЛЮШКА.**

### ЛІМІТ НА СТАМАТОЛАГА

Страхаванне ад няшчасных выпадкаў і хвароб на час паездкі за мяжу, па словах Святланы Вітальеўны, самы запатрабаваны від страхавання ў летні сезон. У такую страхоўку ўваходзіць аказанне хуткай неадкладнай медыцынскай дапамогі, медыка-транспартная дапамога, гэта значыць транспарціроўка хворага, тэлекамунікацыйная сувязь, юрыдычныя паслугі, звязаныя з надыходам страхавога выпадку, і рэпатрыяцыя (дапамога ў вяртанні цела на радзіму ў выпадку смерці застрахаванай асобы).

З-за таго, што за мяжой вельмі дарагія паслугі стаматолага, а праверыць, быў зварот у сувязі з вострым болем ці чалавеку проста захацелася палячыць зубы, складана, усе страхоўшчыкі ўстанаўліваюць ліміт на стаматалагічныя паслугі. У «Белдзяржстраху» ліміт на стаматалагічную неадкладную дапамогу ўстаноўлены ў межах 100 у. а. «На гэтую суму, вядома, палячыць зубы немагчыма, але можна абязболіць, раскрыць канал, пакласці лекі…» — тлумачыць Святлана Мялюшка.

### ТОЛЬКІ ЗА МЯЖОЙ!

Медыцынская частка страхоўкі дзейнічае ў дачыненні толькі да тых захворванняў, якія адбыліся з чалавекам за мяжой. Гэта, як правіла, харчовыя атручэнні, грып, траўмы, востры апендыцыт і іншыя падобныя непрыемнасці.

Што тычыцца хранічных захворванняў, іх вам ніхто лячыць за мяжой не будзе. Медыцынская дапамога пры гэтым аказваецца толькі ў тых выпадках, калі прысутнічае пагроза жыццю.

— Наогул, хуткая неадкладная медыцынская дапамога пры абвастрэнні хранічных захворванняў аказваецца ў межах 10% ад страхавой сумы,— тлумачыць наш кансультант.— Таму, калі за мяжу выязджае пажылы чалавек з наяўнасцю хранічных захворванняў, мы рэкамендуем яму застрахавацца на суму не ніжэй за 70 тысяч долараў ці 30 тысяч еўра.

СТАР. 7

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ



### ЕС ацаніў страты ад забароны імпарту ў Расію ў 12 мільярдаў еўра

Страты ЕС ад увядзення Расіяй забароны на пастаўкі харчавання з еўрапейскіх краін могуць дасягнуць 12 мільярдаў еўра. Пра гэта заявіў пасол ЕС у Маскве Вігаўдас Ушацкас. Акрамя таго, старшыня французскай Нацыянальнай федэрацыі прафсаюзаў сельскагаспадарчых вытворцаў Ксаўе Бёлен адзначыў, што эмбарга на экспарт у Расію прадуктаў з Еўропы можа прывесці да крызіснай сітуацыі на еўрапейскім рынку. Паводле яго слоў, калі прызначаная для экспарту прадукцыя не будзе паступаць на расійскі рынак, яна абрынецца на еўрапейскі. Шведскія вытворцы харчовых тавараў, у сваю чаргу, выказалі надзею на тое, што забарона на экспарт прадукцыі ў РФ не будзе доўгачасовай, паколькі не хацелі б губляць расійскі рынак. У Грэцыі праблем асцерагаюцца ў першую чаргу пастаўшчыкі садавіны і агародніны. У сувязі з гэтым апазіцыя заявіла, што санкцыі могуць прывесці да поўнага банкруцтва грэчаскіх фермераў, і запатрабавала ад урада краіны неадкладна адмовіцца ад санкцый супраць Расіі. У Афінах таксама выказваюць занепакоенасць і з нагоды экспарту-імпарту абароннай прадукцыі. Канадскія вытворцы прадуктаў са свініны заявілі, што вельмі занепакоены расійскімі абмежаваннямі. Як паведамляецца, падобныя меры могуць стаць сур'ёзным ударам для свінагадоўлі, паколькі Расія з'яўляецца ў гэтай галіне трэцім па велічыні рынкам збыту. Учора стала вядома, што разам з прадуктовымі санкцыямі ўрад Расіі таксама абвясціў аб забароне транзітных рэйсаў украінскіх авіякампаній, якія выконваюць палёты праз паветраную прастору Расіі. Дзмітрый Мядзведзеў заявіў, што аналагічныя меры таксама могуць быць прыняты ў дачыненні да авіякампаній з ЕС і ЗША.

### Мэрыю Кіева эвакуіравалі



Мэрыю Кіева поўнасцю эвакуіравалі з-за пагрозы паўторнага захопу будынка актывістамі Майдана. Пра гэта паведамляе Вести.ua са спасылкай на прэс-сакратара намесніка кіраўніка Кіеўскай гарадской дзяржадміністрацыі Алесю Астафіеву. «Да нас паступіла паведамленне, што мэрыю могуць зноў захапіць, і на вуліцы з'явіліся барыкады. Таму, навучаныя горкім вопытам мінулага захопу ў снежні, мы адразу забралі ўсе свае рэчы і тэхніку — у прыватнасці, камп'ютары»,— адзначыла Астафіева. Між тым, агенцтва УНП паведаміла, што ў будынку мэрыі забарыкадзіраваліся ўзброеныя аўтаматамі мужчыны ў камуфляжнай форме. Раней, у чацвер 7 жніўня, камунальныя службы Кіева паспрабавалі разабраць некалькі палатак на майдане Незалежнасці ў рамках планавай ачысткі цэнтра горада ад барыкад, якая працягваецца ўжо некалькі месяцаў. Аднак актывісты Майдана перашкодзілі зносу лагера і падпалілі пакрышкі. Супрацьстаянне перарасло ў сутыкненні з супрацоўнікамі праваахоўных органаў, выкарыстоўваліся святло-шумавыя гранаты з аднаго боку, каменне і іншыя падручныя сродкі — з другога. На плошчы зноў пачалі ўзводзіць барыкады. Ёсць пацярпелыя.

ISSN 1990 - 763X

14148

9 771990 763008

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### Бульба заменіць цэлую гару вітамінаў?



Бульбу рэдка ўключаюць у спісы карысных прадуктаў. Але, на думку супрацоўнікаў цэнтра MNT Knowledge Center, бульба можа насыціць рацыён важнымі рэчывамі. Звычайна бульбу абвінавачваюць у высокай колькасці крухмалу і каларыйнасці. На самой справе, у сярэдняй бульбіне 164 калорыі, 0,2 грама тлушчу, 0 грамаў халестэрыну, 37 грамаў вугляводаў, 4,7 грама клятчаткі і 4,3 грама бялку. У ёй — 2% ад дзённай нормы кальцыю, 51% вітаміну С, 9% жалеза, 30% вітаміну $B_6$, 12% магнію і 25% калію. У бульбе таксама ёсць фосфар, ніяцын, фаліевая кіслата, халін і цынк. Што важна, у неапрацаванай бульбе вельмі мала солі (менш за 1% ад дзённага ліміту). Асобнае пытанне — колькасць альфа-ліпоевай кіслаты. Яна дапамагае арганізму ператвараць глюкозу ў чыстую энергію. У шалупінні бульбы можна знайсці флаваноід кверцэтын, які валодае магутнымі супрацьзапаленчымі ўласцівасцямі і функцыямі антыаксіданту. Такім чынам, бульба дапамагае падтрымаць здароўе касцей, спрыяе выпрацоўцы калагену, кантралюе ўзровень крывянога ціску. Бульба ў рацыёне дазволіць знізіць узровень халестэрыну, што абароніць сэрца. Вітамін $B_6$ не дае назапашвацца гомацыстэіну, які шкодзіць сасудам. А халін рэгулюе сон, работу мышцаў, працэс навучання і памяць. Фаліевая кіслата з бульбы ўдзельнічае ў сінтэзе і аднаўленні ДНК, не дае ўтварацца ракавым клеткам.

КОРАТКА

Пастаянны маніторынг абстаноўкі па забеспячэнні пажарнай бяспекі будзе праводзіцца ў Беларусі.

**Усе работы на будаўніцтве цэнтра фрыстайла ў Мінску плануецца завяршыць да 30 верасня, паведаміў міністр спорту і турызму Аляксандр Шамко.**

У Беларусі прадаўцам забаронена рэзаць і надразаць кавуны і дыні.

**6 жніўня ратавальнікі 4 разы выязджалі на ліквідацыю асіных гнёздаў у дзіцячых садках Мінска. У жніўні насякомыя становяцца найбольш агрэсіўнымі і могуць уяўляць небяспеку для людзей, якія пакутуюць ад алергіі, а тым больш для дзяцей.**

За мінулы тыдзень у краіне патанула рэкордная колькасць чалавек. З 28 ліпеня па 3 жніўня ахвярамі вады сталі 57 чалавек, сярод іх 6 непаўналетніх.

■ Праверана на сабе

# ПЧАЛІНАЯ АЎРА… ЛЕЧЫЦЬ

**Карэспандэнт «Звязды» адным з першых адчуў на сабе ўздзеянне біяполя пчол**

**У Віцебскім абласным клінічным скурна-венералагічным дыспансеры працуюць першапраходцы ў пытанні ўкаранення нетрадыцыйных метадаў медыцыны. Менавіта гэтыя людзі ў белых халатах першымі ў краіне пачалі лячыць пацыентаў пры дапамозе п'явак, рыб, камянёў, «жывой» і «мёртвай» вады. Дарэчы, і пчол раней выкарыстоўвалі, каб дапамагаць хворым. А цяпер насякомыя ў дыспансеры, можна сказаць, «павысілі кваліфікацыю» — лечаць не джаламі, а аўрай.**

СТАР. 6



# ПАТУРАЦЬ БЕСПАКАРАНАСЦІ НЕЛЬГА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аляксандр Лукашэнка цікавіўся пазіцыяй адносна магчымых вынікаў плануемых карэкціровак заканадаўства, новаўвядзенняў. «У прыватнасці, ці добра вы сабе ўяўляеце механізм практычнай рэалізацыі прапанаваных да замацавання прававых норм? Словам, каб закон не быў мёртвым, асабліва такія новаўвядзенні. А то мы прымем гэтыя рашэнні, а на справе не зможам выканаць», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што дасудовае пагадненне аб супрацоўніцтве прызначана павысіць раскрывальнасць злачынстваў, а не стаць сродкам скарачэння тэрміну крымінальным элементам. Як адзначыў кіраўнік дзяржавы, дасудовае пагадненне аб супрацоўніцтве выклікала шмат дыскусій. У прыватнасці, па яго ўмовах злачынцу, каб скараціць тэрмін свайго пакарання, трэба будзе паведаміць аб чужых злачынствах. Аднак, як адзначыў Прэзідэнт, адразу ўзнікае пытанне: а ці не заваляць злачынцы следчыя органы «казкамі» пра выдуманых саўдзельнікаў? «Ці не будуць нагаворваць на любога дзеля ўратавання сваёй шкуры? Ці не стане такое пагадненне для асабліва небяспечных крымінальных элементаў спосабам пазбегнуць строгай заслужанай адказнасці? — пацікавіўся Аляксандр Лукашэнка. — І давайце шчыра: ці ўпэўнены мы ў сваіх праваахоўніках, у тым, што яны будуць прымяняць такое пагадненне толькі ў законных мэтах? А не для ўласнай нажывы, атрымліваючы адкаты пры заключэнні пагадненняў аб супрацоўніцтве за цалкам легальнае аблягчэнне лёсу злачынцаў».

Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся, ці сапраўды ў канчатковым выніку гэты інструмент павысіць раскрывальнасць злачынстваў і наколькі эфектыўна ён будзе дзейнічаць.

На нарадзе таксама разглядаліся меры адказнасці, не звязаныя з ізаляцыяй ад грамадства, — штрафы, крымінальна-прававая кампенсацыя. «Мы іх актыўна пашыраем у гэтым праекце. Але ці ёсць гарантыя, што гэтыя меры будуць прымяняцца менавіта да тых, хто дастойны паблажкі, каго і сапраўды лепш пакараць рублём, а не адседжваннем?» — задаў пытанне Прэзідэнт. Ён таксама пацікавіўся, ці зможа матэрыяльнае ўздзеянне замест рэальнага тэрміну забяспечыць выпраўленне гэтых асоб і ці трэба ўводзіць такія патуранні па ўсіх складах злачынстваў, якія карэкціруюцца праектам у адпаведнай частцы.

Аляксандр Лукашэнка сказаў, што трэба дакладна прадставіць адказы на ўсе гэтыя пытанні і мець цвёрдую ўпэўненасць у правільнасці зададзенага праектам вектара ўдасканалення крымінальнага і крымінальна-працэсуальнага заканадаўства.

## ПРАФІЛАКТЫКА — ГАЛОЎНАЕ

### Прэзідэнт запатрабаваў узмацніць работу МУС па прафілактыцы і спыненні бытавых злачынстваў

**Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам міністра ўнутраных спраў Ігара Шуневіча, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

Кіраўнік дзяржавы праінфармаваны аб выніках работы МУС за шэсць месяцаў, аб аператыўнай абстаноўцы і некаторых аспектах барацьбы з найбольш небяспечнымі злачынствамі.

У прыватнасці, Прэзідэнт звярнуў увагу на рост колькасці бытавых забойстваў, у сувязі з чым міністр праінфармаваў аб прымаемых у гэтым напрамку мерах. Асноўная частка такіх злачынстваў учынена ў стане алкагольнага ап'янення. Кіраўнік дзяржавы запатрабаваў узмацніць работу МУС па прафілактыцы і спыненні ў тым ліку такіх злачынстваў.

Прэзідэнту дакладзена таксама аб змяненнях у штатнай структуры МУС і кандыдатурах па некаторых пасадах, якія плануецца замяшчаць у бліжэйшы час. Адной з тэм даклада стала рэфармаванне сістэмы органаў унутраных спраў. Асноўныя яго этапы пройдзены паспяхова, цяпер ідзе дапрацоўка некаторых аспектаў. Да канца года, як і патрабаваў Прэзідэнт, рэфармаванне плануецца завяршыць.

Акрамя таго, абмяркоўваліся пытанні спартыўнай тэматыкі. Напрыклад, удзел МУС і міністра ў дзейнасці наглядальнага савета хакейнага клуба «Дынама-Мінск». У тым ліку размова ішла аб навядзенні парадку ў фінансавай дзейнасці клуба, асабліва, што датычыцца заработнай платы ўдзельнікаў. Разглядаліся перспектывы развіцця хакейнага клуба ў цэлым.

### ПРАМАЯ ЛІНІЯ МІНІСТЭРСТВА ЎНУТРАНЫХ СПРАЎ

У **аўторак, 12 жніўня,** пройдзе прамая тэлефонная лінія з **намеснікам міністра ўнутраных спраў — начальнікам міліцыі грамадскай бяспекі Мікалаем Аляксандравічам МЕЛЬЧАНКАМ.**

Пытанні аб забеспячэнні асабістай і маёмаснай бяспекі, своечасовым рэагаванні на паведамленні аб правапарушэннях, ахове грамадскага парадку, прафілактыцы злачынстваў, забеспячэнні бяспекі дарожнага руху, а таксама аказанні ахоўных паслуг можна задаць с **11.00 да 12.00 гадзін па тэлефоне (8017)218-55-30.**

■ Збіраемся ў школу

# БЕЛАРУСКІЯ ВЫТВОРЦЫ: «НАМ ЁСЦЬ ШТО ПРОЦІПАСТАВІЦЬ КАНКУРЭНТАМ З РЫНКАЎ»

**Анамальная спёка, якая ўсталявалася ў Беларусі ў апошнія тыдні, адбілася ў тым ліку і на гандлі школьнымі таварамі.**

Як расказала журналістам **начальнік упраўлення спажывецкага рынку нехарчовых тавараў Міністэрства гандлю Ніна ПАШКО,** бацькі з дзецьмі пакуль не вельмі спяшаюцца ў гандлёвыя арганізацыі, каб абнавіць да новага навучальнага года свой гардэроб. Прынамсі, аб'ёмы продажу школьных тавараў на сёння пакуль адстаюць ад леташніх паказчыкаў. Але традыцыйна самы «гарачы» час для гандлёвых секцый, якія прапануюць тавары для школьнікаў, — апошняя дэкада жніўня. І наўрад ці гэты год стане выключэннем.

Аднак вытворцы дарэмна час не губляюць і ўжо сёння вельмі ўважліва вывучаюць попыт на сваю прадукцыю, каб, па-першае, пераканацца, угадалі яны ці не ўгадалі з тымі ці іншымі фасонамі, каляровай гамай, памернай шкалой, а па-другое, каб паспець скарэктаваць сваю вытворчасць у бок найбольш запатрабаваных мадэляў.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

— Напрыклад, нашы кансультанты, якія працуюць у гандлёвых аб'ектах, заўважылі, што сёлета большым попытам карыстаюцца «нізы» — спадніцы і штаны, а не цэлыя камплекты, — расказвае **начальнік аддзела распрацоўкі дзіцячага асартыменту ЗАТ «Калінка» Алена ГВАЗДОВІЧ.** — Літаральна сёння мы аператыўна запускаем у вытворчасць дадаткова спадніцу для старэйшых школьніц, якая прывабіла дзяўчат. Камплект, які выпускаўся, быў разукамплектаваны, паколькі дзяўчатам больш спадабалася менавіта спадніца. Будзем спрабаваць максімальна задаволіць попыт на гэту мадэль. А ўвогуле, зыходзячы з нашага досведу, магу сказаць, што на першым месцы па папулярнасці ў дзяўчат стаяць сарафаны, якія займаюць прыкладна 60% у агульных аб'ёмах нашай школьнай калекцыі. На другім месцы ідуць касцюмы. Але сёлета гандаль папрасіў нас больш пашыць спадніц.

— Мы таксама заўважылі, што для хлопчыкаў часцей набываюць не касцюмы, а штаны, — падтрымала калегу **намеснік дырэктара па якасці ААТ «Славянка» Галіна ЮРКО.** — Магчыма, касцюм застаўся ў гардэробе яшчэ з мінулага года, а штаны — і больш танны, і больш універсальны варыянт: з імі можна камбінаваць кашулі, камізэлькі і пуловеры.

Дарэчы: «Славянка» захавала цэны на адзенне для школьнікаў на ўзроўні мінулага года. Адпускная цана без падатку на дабаўленую вартасць на касцюм для хлопчыка малодшага школьнага ўзросту складае 390 тысяч рублёў, для старэйшых школьнікаў — 450 тысяч, штаны для хлопчыкаў — 135 тысяч рублёў, сарафаны для дзяўчат — 140–150 тысяч.

Па словах Ніны Пашко, беларускія тавары, прадстаўленыя ў гандлёвых арганізацыях, маюць самы шырокі дыяпазон цэн у залежнасці ад саставу сыравіны, мадэляў і іншых характарыстык. Па падліках спецыялістаў, экіпіроўка школьнікаў малодшых класаў абыдзецца бацькам ад 1,2 мільёна рублёў да 4,8 мільёна, старшакласнікаў — ад 1,3 да 5,1 млн рублёў. У гэту суму ўваходзяць швейныя, трыкатажныя вырабы, абутак (штодзённы і спартыўны) і школьныя канцылярскія прылады.

Канкурэнцыі з рэчавымі рынкамі, куды бацькі з дзецьмі могуць накіравацца па больш танныя тавары, беларускія вытворцы не баяцца.

— У першую чаргу наша прадукцыя выйграе ў якасці, — сцвярджае Галіна Юрко. — Безумоўна, мы сочым за нашымі канкурэнтамі, набываем узоры іх прадукцыі для азнаямлення з матэрыяламі, з якіх яны пашытыя, з тэхналогіямі шыцця. Сёлета такая работа таксама была зроблена і, магу запэўніць, што мы выкарыстоўваем больш дасканалыя тэхналогіі апрацоўкі швоў, больш сучасныя і надзейныя камплектуючыя, таму наша прадукцыя не страчвае форму пасля носкі і мыцця. Усе нашы вырабы адпавядаюць тэхнічнаму рэгламенту Мытнага саюза. І працуем мы ў рамках Закона «Аб абароне правоў спажыўцоў».

Вельмі важна, што і ў крамах, і на школьных кірмашах бацькі школьнікаў могуць пакінуць заяўку на канкрэтную мадэль ці канкрэтны памер, якія ў гэты момант адсутнічаюць у продажы. Гэтая паслуга асабліва актуальная для невялікіх населеных пунктаў, хоць і ў Мінску пакупнікоў не павінны адпраўляць у іншы магазін…

Дазваляецца таксама разукамплектаваць касцюм: цана пазначаецца не на ўвесь выраб цалкам, а кожны элемент ацэньваецца асобна.

Беларускія вытворцы ўлічылі заўвагі і пажаданні гандлёвых прадпрыемстваў і пакупнікоў, таму пачалі шыць адзенне для поўных дзяцей і дзяцей з нестандартнымі фігурамі. Гэта так званае адзенне-трансформер: спадніцы з запа́хам на два рады гузікаў, штаны з рэгулятарам таліі «стандарт», «+3 см», «+ 6 см» і «+12 см», блузы з трыкатажнымі ўстаўкамі, мадэлі з гарсэтамі для дзяўчат. Скажам, для малодшых школьніц цяпер шыецца адзенне з аб'ёмам у грудзях да 80 сантыметраў.

Што тычыцца абутку, то школьная калекцыя заканчваецца для хлопчыкаў 40-м памерам, а для дзяўчат — 37-м. Калі нага акажацца большай, то, на жаль, пакупнікам параяць прайсці ў секцыю з абуткам для дарослых…

Сёлета беларускія вытворцы прапануюць шмат цікавых знаходак: камплекты адзення для дзяцей з ушытымі тэрмометрамі, з дапамогай якіх бацькі змогуць кантраляваць тэмпературу цела дзяцей, адзенне з кішэнямі для мабільнага тэлефона, якія абараняюць дзіця ад шкоднага электрамагнітнага выпраменьвання, пінжакі з віскознай падкладкай з табліцай множання і геаметрычнымі формуламі.

Зноў-такі з улікам запатрабаванняў пакупнікоў 70 мадэляў у калекцыі школьнага адзення пашыты з тканін з высокім працэнтам натуральных валокнаў. Праўда, і цэны на такое адзенне могуць «кусацца»…

**І ў магазінах, і на школьных кірмашах бацькі школьнікаў могуць пакінуць заяўку на канкрэтную мадэль ці канкрэтны памер, якія ў гэты момант адсутнічаюць у продажы.**

Немалаважна, што практычна ўсе гандлёвыя арганізацыі праводзяць сацыяльныя акцыі, скіраваныя на зніжэнне ці прымяненне мінімальных гандлёвых надбавак на школьны асартымент, продаж гэтых тавараў у растэрміноўку і крэдыт, прадастаўляюць зніжкі шматдзетным сем'ям і сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў. Прычым гэта тычыцца не толькі сталічных прадпрыемстваў гандлю, але і ўсіх рэгіёнаў.

Усяго ў перыяд падрыхтоўкі да новага навучальнага года будуць праведзена больш як 2300 выстаў-продажаў школьных тавараў, у тым ліку 220 — з дэманстрацыяй мадэляў адзення і абутку.

**23–24 жніўня** ў Мінску на праспекце Пераможцаў, у раёне Палаца спорту, пройдзе агульнагарадскі школьны кірмаш з удзелам вытворцаў і гандлёвых арганізацый. А з **23 па 31 жніўня** ў Нацыянальным выставачным цэнтры «Белэкспа» на вуліцы Янкі Купалы пройдуць 15-я спецыялізаваная выстава-кірмаш «Прывітанне, школа» і 8-я міжнародная выстава-кірмаш «Нашым дзецям-2014». Такім чынам, зрабіць усе карысныя пакупкі бацькі змогуць у адным месцы.

**Надзея НІКАЛАЕВА** ■

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

### ПЕНСІЯНЕРЫ АТРЫМАЮЦЬ МЕСЦЫ НА РЫНКАХ

**Сталічныя рынкі падтрымалі ініцыятыву Мінгарвыканкама аб прадастаўленні гандлёвых месцаў пенсіянерам і інвалідам на бязвыплатнай аснове.**

Намеснік старшыні Мінгарвыканкама Андрэй Дамарацкі падпісаў пагадненні з кіраўнікамі 12 харчовых (змешаных) рынкаў Мінска: Камароўскага, Чэрвеньскага, Кастрычніцкага, Курасоўшчынскага, Чыжоўскага, Велазаводскага, «Ждановічы», «Ракаўскі кірмаш», «Гандлёвыя рады», «Свелта», «Серабранка», «Малінаўка». На названых рынках пры прад'яўленні дакументаў, што пацвярджаюць ільготу, пенсіянеры і інваліды змогуць без выплаты арэнды прадаваць за дзень да 20 кілаграмаў сельскагаспадарчай прадукцыі, вырашчанай на ўласным участку. У Мінгарвыканкаме адзначылі, што працягваецца праца па ўзгадненні дагавароў з іншымі рынкамі.

**Кацярына РАДЗЮК.**

### КАНІКУЛЯРНЫ ГРАФІК ШКОЛ

**Вучэбныя заняткі ў беларускіх школах распачнуцца сёлета як звычайна — 1 верасня. Пра гэта паведаміла прэс-служба Міністэрства адукацыі.**

Нагадаем, што два апошнія гады з-за таго, што 1 верасня прыпадала на выхадныя дні, пачатак навучальнага года пераносіўся. А завершыцца навучальны год для беларускіх школьнікаў 30 мая. Першая вучэбная чвэрць будзе доўжыцца з 1 верасня па 25 кастрычніка. Другая — з 3 лістапада па 27 снежня. Трэцяя — з 12 студзеня па 21 сакавіка і чацвёртая — з 30 сакавіка па 30 мая. Такім чынам, працягласць асенніх і вясенніх канікул складзе 8 дзён. Зімой школьнікі будуць адпачываць 15 дзён і 93 дні — летам. Для навучэнцаў 1 і 2 класаў у трэцяй чвэрці прадугледжаны дадатковыя канікулы працягласцю адзін тыдзень — з 16 па 22 лютага 2015 года. А для юнакоў і дзяўчат, якія завяршылі навучанне на ІІ ступені агульнай сярэдняй адукацыі, летнія канікулы распачнуцца 14 чэрвеня — пасля здачы выпускных экзаменаў за курс базавай школы.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

### У ЦЯГНІК ЛЕПШ З БІЛЕТАМ

**Беларуская чыгунка праводзіць дэкаду кантролю за безбілетным праездам у цягніках рэгіянальных ліній эканом-класа.**

Яна пройдзе на ўсіх аддзяленнях магістралі. Графік праверак наяўнасці праязных дакументаў пабудаваны такім чынам, каб максімальна ахапіць кантролем цягнікі рэгіянальных ліній эканом-класа, распавялі ў прэс-цэнтры Беларускай чыгункі. У іх возьмуць удзел кантралёры-рэвізоры разам з работнікамі ваенізаванай аховы і супрацоўнікамі транспартнай міліцыі. Апроч гэтага, на станцыях адпраўлення і абароту цягнікоў будзе праводзіцца перонны кантроль наяўнасці ў грамадзян праязных дакументаў. Паралельна ў перыяд правядзення дэкады суцэльнага кантролю будзе праведзены і маніторынг пасажырапатоку.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### РЭЗЕРВЫ ЗНОЎ ЗМЕНШЫЛІСЯ

**Па выніках ліпеня золатавалютныя рэзервы Беларусі, згодна з метадалогіяй МВФ, зменшыліся на 216,8 млн долараў ЗША і, паводле папярэдніх звестак, на 1 жніўня склалі 6209,2 млн долараў у эквіваленце.**

У нацыянальным вызначэнні рэзервы, наадварот, павялічыліся — на 7,9 млн долараў і на 1 жніўня склалі 7 177,5 млн у эквіваленце. «На зніжэнне аб'ёму золатавалютных рэзерваў у ліпені паўплывала пагашэнне ўрадам і Нацыянальным банкам знешніх і ўнутраных абавязацельстваў у замежнай валюце ў поўным аб'ёме, а таксама памяншэнне кошту золата на міжнародным рынку каштоўных металаў. Падтрыманню — станоўчае сальда куплі-продажу Нацбанкам замежнай валюты на ўнутраным валютным рынку», — паведамляе ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацыянальнага банка.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

### ЗАМЕСТ «МОТАЛЬСКІХ ПРЫСМАКАЎ» — «ЛЕТНІК РАМЁСТВАЎ»

**Як паведаміў старшыня Мотальскага сельсавета Сяргей Піліповіч, сёлета фестываль «Мотальскія прысмакі» праводзіцца не будзе. Прынята рашэнне зрабіць культурна-кулінарнае свята біенале, гэта значыць, раз на два гады.**

Але ў другія выхадныя жніўня ў Моталі ўсё ж адбудзецца мерапрыемства, хоць і не такое маштабнае, як у папярэднія гады. Беларускае грамадскае аб'яднанне «Адпачынак у вёсцы» ў партнёрстве з ПРААН запланавала «Летнік рамёстваў». Яго распачне «круглы стол» па пытаннях развіцця народных рамёстваў. У праграме таксама наведванне аграсядзіб, знаёмства з народнымі абрадамі. Гасцямі Моталя ў гэты дзень стануць рамеснікі з розных раёнаў вобласці.

**Яна СВЕТАВА.**

### ЗАТРЫМАЦЬ І АБЯСШКОДЗІЦЬ

**Заложнікам дэбашыра ў вёсцы пад Жабінкай стала 7-месячнае немаўлятка.**

У выканаўцы абавязкаў начальніка раённага РАУС Андрэя Лаготы быў выхадны дзень. Яму паведамілі пра званок на пульт дзяжурнага, і падпалкоўнік тут жа выехаў на месца. 25-гадовы, двойчы судзімы п'яны дэбашыр пагражаў сваёй сужыцельцы забойствам іх сямімесячнага сына. Па тэлефоне перадалі, што ў адной руцэ ён трымае дзіця, а ў другой — вялікі нож. Сітуацыя ўскладнялася тым, што зламыснік раней працаваў на бойні, а значыць, умела абыходзіцца з нажом.

Калі Андрэй Лагота прыехаў у вёску, то застаў там нарад міліцыі, у слязах маці дзіцяці і яго бабулю. П'яны мужчына размахваў дзіцем, нібы рэччу, і пагражаў, што заб'е малога, як толькі да яго наблізяцца міліцыянеры. Падпалкоўнік быў без формы. Паказаўшы свае пустыя рукі, ён павольна рушыў насустрач злачынцы, пастараўся завязаць з ім дыялог. Дэбашыр нечакана падтрымаў гутарку. Асабліва яго радавала, калі на пытанне, ці страшна, міліцыянер даваў станоўчы адказ. Гэта і ўсыпіла пільнасць хулігана. Ён пайшоў на далейшы кантакт, дазволіў узяць з яго рук дзіця (а потым і нож) і здаўся.

Пазней падчас следства дэбашыр прызнаў сваю віну, а на судзе сказаў, што вельмі ўдзячны міліцыі за тое, што папярэдзілі непапраўнае. Як паведамілі ў прэс-службе Брэсцкага абласнога УУС, нядаўна суд вынес рашэнне аб прымусовым лячэнні і годзе папраўчых работ для жабінкаўскага хулігана.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

### КАБ НЕ ПОМСЦІЛІ ФОТАРАДАРУ

**У дачыненні да невядомых, якія пашкодзілі фотафіксатар хуткасці каля быхаўскай вёскі Чычэвічы, распачата крымінальная справа.**

На Магілёўшчыне за апошні час зарэгістравана некалькі выпадкаў вандалізму ў дачыненні да фотафіксатараў. Дагэтуль іх псавалі з дапамогай фарбы і нават прастрэльвалі з ружжа. Але такое, каб прыбор знялі, занеслі ў лес і там спалілі, здарылася ўпершыню. Дарагое абсталяванне, якое, па некаторых звестках, каштуе каля 25 тысяч еўра, да жыцця ўжо не вярнуць. Цяпер вядуцца пошукі злачынцаў. У дачыненні да іх распачата крымінальная справа.

— Тое, што кіроўцы псуюць прыборы, зразумела: тыя фіксуюць іх парушэнні, — адзначыў **начальнік УУС Магілёўскага аблвыканкама Аляксандр КАВАЛЬЧУК.** — Але не трэба забываць, што мы жывём у прававой дзяржаве і, каб паменшыць колькасць няшчасных выпадкаў, павінны падпарадкоўвацца правілам дарожнага руху. Мы будзем вельмі ўдзячны насельніцтву за любую інфармацыю, якая датычыцца фактаў прычынення шкоды фотафіксатарам.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

### ПЕРАКУЛІЛАСЯ БУРАВАЯ

**Раніцай на 319-м кіламетры трасы М-1 Брэст — Мінск — мяжа Расійскай Федэрацыі паблізу Дзяржынска перакулілася буравая на базе аўтамабіля «Івека».**

У машыны разарвала кола, з-за чаго яна і перакулілася на праезную частку. Пры гэтым адбыўся разліў дызельнага паліва з бака. Каб папярэдзіць узгаранне, работнікам МНС давялося змываць яго. Кіроўцу са шматлікімі траўмамі шпіталізавалі. Расследаванне прычыны і абставін дарожна-транспартнага здарэння праводзіць ДАІ Дзяржынскага раёна.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**



■ Палітычная пятніца з Аляксандрам Шпакоўскім

# З СУСЕДЗЯМІ ТРЭБА ПА-ДОБРАМУ

### ЦІ БУДЗЕ «ПАЦЯПЛЕННЕ» Ў АДНОСІНАХ МІНСКА І ВАРШАВЫ?

**Не так даўно ў беларускай сталіцы адбыліся кансультацыі паміж знешнепалітычнымі ведамствамі Беларусі і Польшчы. Раней, у чэрвені 2014 года, аналагічныя кансультацыі прайшлі ў Варшаве. Зыходзячы з таго, што на сучасным этапе стасункі Беларусі з Польшчай маюць няпросты характар, гэтая падзея мае важнае значэнне не толькі для развіцця двухбаковых адносін, але і для лініі айчыннай дыпламатыі па нармалізацыі кантактаў афіцыйнага Мінска з краінамі Захаду.**

## Цяжкі ўчастак працы

У шэрагу краін, да якіх у Беларусі павінна быць асаблівае стаўленне і, напэўна, асобая палітыка, Польшча, безумоўна, знаходзіцца сярод першых. Улічваючы вагу, якую набірае гэтая дзяржава ў Еўрапейскім Саюзе, а таксама звяртаючы ўвагу на яе стасункі са Злучанымі Штатамі, можна, без перабольшвання, сказаць, што адна з брам у заходні свет для Беларусі знаходзіцца ў Варшаве, а шмат хто на Захадзе і дагэтуль глядзіць на нашу краіну «польскімі вачыма».

Агульнасць гістарычнага шляху на пэўных этапах, моцныя гуманітарныя сувязі, наяўнасць значнай польскай дыяспары ў Беларусі, а беларускай — у Польшчы і яшчэ шмат якія фактары прымушаюць кіраўніцтва краін да дыялогу і пошуку прымальных формаў партнёрства. Калі пры гэтым сказаць, што стасункі беларускай і польскай дзяржаў вельмі няпростыя, значыць, не сказаць нічога. Нягледзячы на тое, што Польшча стала другой пасля Украіны краінай, якая ўстанавіла дыпламатычныя адносіны з Рэспублікай Беларусь, палітычныя стасункі з афіцыйнай Варшавай з'яўляюцца, бадай, найбольш цяжкім участкам працы для спецыялістаў айчыннага МЗС.

Прыкладна такое ж стаўленне да афіцыйнага Мінска — разуменне неабходнасці кааперацыі і наяўнасці перашкод палітычнага зместу — характэрна таксама для польскіх экспертных і дыпламатычных колаў, што спецыялізуюцца на беларускай праблематыцы. Нягледзячы на тое, што па выніках 2013 года гандлёва-эканамічны абарот паміж краінамі перавысіў тры мільярды долараў, чыноўнікі як з беларускага, так і з польскага боку неаднаразова канстатавалі, што «патэнцыял да супрацоўніцтва не рэалізуецца ў поўнай меры», а артыкулы з загалоўкамі кшталту «Нерэалізаваныя магчымасці» нібы пад капірку сістэматычна з'яўляюцца на старонках друкаваных выданняў па абодва бакі мяжы.

Зразумела, у беларусаў і палякаў зусім розныя, фактычна супрацьлеглыя, погляды на крыніцы існуючых непаразуменняў. Гэтак жа відавочна, што прычыны беларуска-польскіх супярэчнасцяў не могуць знаходзіцца ў сферы знешняй палітыкі толькі адной краіны.

## Экскурс у гісторыю

У навейшай постсацыялістычнай гісторыі абедзвюх краін, што для Польшчы пачалася ў 1989 годзе, а для Беларусі — у 1991-м, можна вызначыць некалькі этапаў развіцця міждзяржаўных стасункаў. Зробім невялікі экскурс у гісторыю, каб сутнасць сённяшніх адносін Беларусі і Польшчы стала больш зразумелай.

**Першы этап можна акрэсліць 1991–1994 гадамі.** Гэта перыяд актывізацыі двухбаковых кантактаў, калі польская дзяржава, імкнучыся як мага хутчэй інтэгравацца ў Еўрапейскі саюз і НАТА, адначасова імкліва збліжалася з былымі савецкімі рэспублікамі. Пры гэтым польскае кіраўніцтва імкнулася стварыць у суседніх дзяржавах моцныя эканамічныя пазіцыі, забяспечыць лаяльнасць да Варшавы з боку мясцовай фінансавай і палітычнай эліты і, у рэшце рэшт, прыняць на сябе адказнасць за краіны постсавецкай прасторы, іх «дэмакратызацыю», у вачах заходняга істэблішмента. Польскі бок дэманстраваў гатоўнасць прыняць на сябе функцыі своеасаблівага «даху» для новых дзяржаў у арганізацыі іх супрацоўніцтва з рознымі еўрапейскімі інстытутамі, што, зразумела, павышала геапалітычны прэстыж Польшчы, і ў той жа час цалкам упісвалася ў інтарэсы знешняй палітыкі постсавецкіх новаўтварэнняў.

**На працягу другога этапу, 1995–2008 гадоў,** у Беларусі адбывалася станаўленне дзяржаўнасці на аснове прэзідэнцкай рэспублікі, былі канчаткова расстаўлены знешнепалітычныя прыярытэты. Зыходзячы з нацыянальных інтарэсаў, беларуская дзяржава выбрала курс на захаванне былых сувязяў, стварэнне Саюзнай дзяржавы з Расіяй, стала адным з ініцыятараў рэінтэграцыі на постсавецкай прасторы. Такі выбар беларускага народу не супадаў з курсам польскага кіраўніцтва, задачай якога было далучэнне нашай краіны да ЕС і НАТА.

Знешнепалітычная канцэпцыя сучаснай Польшчы («дактрына Гедройца — Мерашэўскага») заснавана на прызнанні факта існавання «паміж Польшчай і Расіяй» незалежных Беларусі, Літвы і Украіны, чый суверэнітэт больш не можа быць прадметам расійска-польскага геапалітычнага супрацьстаяння. Беларуска-расійская інтэграцыя памылкова разумелася польскім кіраўніцтвам як «імперскі праект Масквы», што негатыўна адбілася на двухбаковых стасунках. Пры гэтым польскі бок не звярнуў увагі на той факт, што Беларусь у розных міждзяржаўных саюзах з удзелам Расіі мае значна большую ступень самастойнасці, чым сама Польшча ў рамках ЕС ці ў адносінах з ЗША.

Прыход да ўлады ў Польшчы ў 2005 годзе нацыяналістычна і антырасійска скіраваных братоў Качынскіх яшчэ больш узмацніў супярэчнасці паміж Мінскам і Варшавай. Польшча ў гэты час канчаткова сцвярджаецца як апора для дзейнасці беларускіх дысідэнцкіх арганізацый, з польскай тэрыторыі ажыццяўляецца фінансаванне некаторых працэсаў беларускай палітыкі, фактычна з дзяржаўнага бюджэту Польшчы фінансуюцца так званыя «незалежныя» СМІ антыдзяржаўнага зместу, адбываюцца спробы штучна палітызаваць дзейнасць польскай дыяспары, што па выніках прывяло да расколу Саюза палякаў Беларусі, калі абсалютная большасць сяброў гэтай арганізацыі не пажадала ўдзельнічаць у палітычнай авантуры і засталася лаяльнай да нашай дзяржавы. Зразумела, што такая лінія польскага кіраўніцтва вельмі нервова ўспрымалася беларускім бокам і не магла не адбіцца негатыўна на магчымасцях узаемадзеяння.

«Часам няспраўджаных надзей» у беларуска-польскіх стасунках можна смела назваць **перыяд з 2008 па 2010 гады.** Перамога схільнай да больш умеранай палітыкі ў адносінах да Расіі польскай партыі «Грамадзянская платформа» на парламенцкіх выбарах 2007 года, прызначэнне Дональда Туска прэм'ер-міністрам і ініцыяцыя Польшчай праграмы ЕС «Усходняе партнёрства» некаторым чынам паўплывалі і на змену знешнепалітычнага курсу афіцыйнай Варшавы ў дачыненні да Мінска. У гэты час прайшло некалькі сустрэч Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з кіраўніком МЗС Польшчы Радаславам Сікорскім, быў падпісаны дагавор аб малым памежным супрацоўніцтве, зроблены шэраг іншых захадаў па нармалізацыі стасункаў.

Прэзідэнт Беларусі ў лютым 2010 года адзначаў, што «непаразуменні» паміж Беларуссю і Польшчай магчыма вырашыць пры наяўнасці добрай волі. Аднак тыя спадзяванні, на жаль, так і не былі рэалізаваны пасля прэзідэнцкіх выбараў у снежні 2010 года: польскі бок працягваў умешвацца ва ўнутраную палітыку Беларусі і, па меркаванні беларускіх улад, нясе адказнасць за масавыя беспарадкі, якія адбыліся ў той час у Мінску. Адначасова Польшча асудзіла рашучыя (і, як паказвае сучасная ўкраінская практыка, цалкам слушныя) дзеянні беларускіх праваахоўнікаў і не прызнала вынікі прэзідэнцкіх выбараў. Больш за тое, польскі бок выступіў адным з ініцыятараў агрэсіўнай палітыкі санкцый ЕС у дачыненні да Беларусі, па выніках чаго беларускае кіраўніцтва ахарактарызавала Польшчу як ініцыятара антыбеларускай палітыкі і абвінаваціла яе нават у тэрытарыяльных прэтэнзіях.

**Чацвёрты этап беларуска-польскіх адносін пачаўся ў 2011 годзе і працягваецца па наш час.** Нягледзячы на новую фазу міждзяржаўнага канфлікту, бакі не сталі цалкам разрываць стасункі. Айчынныя аналітыкі па-рознаму ацэньваюць сучасны перыяд адносін паміж краінамі — ад «халоднага міру» да «халоднай вайны», але агульны прыметнік «халодны» цалкам характарызуе сённяшні ўзровень узаемадзеяння.

Відавочна, што найбольш крызісны перыяд у стасунках паміж Мінскам і Варшавай мінуў у 2012 годзе, калі з Польшчы быў адазваны пасол Рэспублікі Беларусь і, фактычна, тое ж было прапанавана зрабіць польскаму боку. Кропкай звароттнага адліку можна назваць сустрэчу кіраўнікоў МЗС Беларусі і Польшчы падчас саміту «Усходняга партнёрства» ў Вільні восенню 2013 года, пасля чаго пачаліся кантакты на ўзроўні спецыялістаў МЗС і іншых ведамстваў.

* * *

Відавочнай задачай двухбаковага дыялогу з'яўляецца праца над памылкамі мінулага, каб пазбегнуць канфліктаў былых гадоў і ўрэшце дасягнуць жаданага ўзроўню беларуска-польскага супрацоўніцтва. Як падаецца, для польскага боку, перш за ўсё актуальна зразумець факт суверэннасці беларускай дзяржавы, якая праводзіць сваю знешнюю палітыку з улікам інтарэсаў асноўных партнёраў, але не пад іх дыктоўку. Адносіны з Расійскай Федэрацыяй не з'яўляюцца перашкодай для адносін Беларусі і Польшчы, гэтак жа, як і польскія ўяўленні аб незалежнасці, дэмакратыі, праве не з'яўляюцца ўніверсальнымі для Беларусі. Таму ў стасунках з нашай краінай для Польшчы мэтазгодна зыходзіць з прагматызму сваіх уласных інтарэсаў, пазбавіцца ад замежнага ўплыву, адмовіцца ад ілюзорных спроб змяніць палітычны лад у Беларусі, як дзеянняў, што напрамую шкодзяць беларуска-польскаму супрацоўніцтву ■

# Рызыка і загартоўка Дзмітрыя Лукшы

TV@R

## Тэлевядучы ведае, як не пераблытаць «смажаны» факт з эксклюзівам

**Можна марыць быць хірургам, а потым жыццё складзецца так, што тваім скальпелем стане... слова. Так і адбылося ў выпадку Дзмітрыя Лукшы, які не першы год вядзе праграму «Зона Х» на «Беларусь 1» і з'яўляецца карэспандэнтам аддзела крымінальных навін. У тэме гэты хлопец вось ужо шосты год, але кажа, што стомленасці ад працоўных будняў не адчувае. Нават у адпачынак не збіраецца. Як ствараецца самая аўтарытэтная праграма крымінальнай хронікі на беларускім тэлебачанні, ці можа праца быць галоўным шчасцем і ці здольны выпадак сапсаваць жыццё, даведаліся ад яго самога.**

**— Нядаўна ты адзначыў 25-годдзе. Як адсвяткаваў дзень народзінаў?**

— Да ўсіх свят я стаўлюся добра, але калі раней дзень нараджэння хацелася святкаваць, закаціўшы банкет на ўвесь свет, то з гадамі (можа, гэта выкліча ўсмешку) хочацца адзначаць яго больш спакойна, у коле блізкіх людзей. 25 гадоў, як мне некаторыя казалі, першы такі асэнсаваны юбілей, таму яго адзначаў шумна, аднак у кампаніі сям'і, сяброў і калег. Задаволены, бо было вельмі весела. Прыемна, што, як казаў кот Бегемот у Булгакава, ніхто не захварэў і не адмовіўся раздзяліць са мной такое свята.

Увогуле, думаю, што наступіў пэўны этап у жыцці, дзе мае значэнне не толькі праца, а і роздумы пра свой далейшы рух. Дарэчы, я выйграў спрэчку ў сваёй аднакласніцы, якой аднойчы сказаў, што ў 25 буду працаваць на тэлебачанні і стану вядучым праграмы. Вользе Бразінскай прывітанне!

**— У працяг тэмы запытаю, як ты ставішся да падарункаў і якія найбольш парадавалі сёлета?**

— З дзяцінства больш люблю атрымліваць падарункі, бо калі даводзіцца шукаць іх самому, то часам губляюся. Але дарыць іх мне таксама прыемна. Шчыра, вельмі люблю сюрпрызы. Калі ў мяне запытваюць, які хачу падарунак, то кажу: як ведаў бы, то сам бы сабе купіў. У гэты раз дарылі рознае. Напрыклад, добрыя напоі, бо многія мае сябры ведаюць, што збіраю калекцыю ў хатні бар. Сям'я спраўдзіла маю мару апошніх двух гадоў — у падарунак ад іх атрымаў швейцарскі гадзіннік. А ў цэлым выбіралі падарункі зыходзячы са сваіх ведаў пра мяне і мае захапленні.

**Дарэчы, я выйграў спрэчку ў сваёй аднакласніцы, якой аднойчы сказаў, што ў 25 буду працаваць на тэлебачанні і стану вядучым праграмы.**

**— Ці бываюць знакі ўвагі ад аўдыторыі, улічваючы, што ты працуеш на тэлебачанні ў праграме «Зона Х»?**

— Бывае, але ружанец, дзякаваць Богу, не прысылалі. На той жа дзень нараджэння атрымаў з дзясятак віншаванняў ад абсалютна незнаёмых людзей. А калегі віншавалі ў эфіры і ў канцы сказалі фразу, якой я звычайна заканчваю праграму: «Галоўнае, Дзіма, беражы сябе!»

**— «Зона Х» — праграма спецыфічнай тэматыкі. Ці ёсць побач з удзячнасцю месца пагрозам?**

— Усялякае бывала, аднак не скажу, што такое часта здараецца. Калі і паступае пэўны негатыў, то імкнуся не ўспрымаць яго сур'ёзна. Памятаю, аднойчы рабіў матэрыял пра секты — потым жанчына чакала мяне пасля эфіру ў фае. А так звычайна пагрозы чуеш, сустракаючы недзе нецвярозую моладзь, і пачынаюцца «панты». Нехта спатыкаецца, парушае закон, і тады замест таго, каб вінаваціць сябе, вінаватых пачынаюць шукаць сярод іншых. У тым ліку і сярод журналістаў, якія расказалі пра іх. Мне здаецца, такая тактыка не дае плёну, лепш бы іх родныя пайшлі і паставілі свечку ў царкве. А замест гэтага яны пішуць, тэлефануюць нам, пачынаюць пагражаць. Я не хачу нікога абвінавачваць ні ў чым, але лічу,



што так нельга. Бо перш за ўсё чыніцца грэх, які на вас і вашых блізкіх людзях.

**— Як праходзіць падрыхтоўка штодзённых выпускаў і выніковай праграмы?**

— Яна праходзіць, можна сказаць, у рэжыме нон-стоп. За паўдня мы павінны сабраць максімальна інфармацыю, што, на шчасце, бывае цяжка зрабіць. А бывае, калі выпуск амаль сабраны, раптам здараецца пажар альбо аварыя ці нешта яшчэ. Пачынаеш усё перарабляць, мяняеш вёрстку сцэнарыя цалкам. Але ў нас усё трымаецца на ўзаемавыручцы калег. Інакш проста немагчыма ў нашай працы. Заўсёды трэба быць гатовымі да таго, што чакаць можна любых падзей. І неабходна граматна пра іх расказаць, таму што людзі хочуць бачыць апошнія навіны крымінальнай тэматыкі за дзень. Не раскажам пра нешта важнае — нас могуць проста не зразумець, і можна страціць аўтарытэт праграмы. А ён набываўся гадамі працы прафесіяналаў. Стараемся трымаць планку. Выніковая праграма змяшчае ў сабе самыя гучныя навіны за тыдзень. Часам нешта цікавае нават не заяўляем у штодзённым выпуску, каб прыберагчы да выніковага: карупцыйныя справы альбо проста нам тэлефануюць гледачы з «гарачымі» фактамі... Ёсць яшчэ і ранішні выпускі, дзе найбольш стараемся вытрымліваць мяжу паміж інфармацыяй і крыміналам. Хочацца ж не азмрочваць нікому пачатак дня.

**— Ты не толькі вядучы, але і робіш сюжэты як карэспандэнт. Можаш параўнаць і сказаць, дзе табе больш падабаецца працаваць?**

— За кадрам працаваць мне вельмі цікава. Разам з тым тут важна, каб вока «не замылілася» і праца не зводзілася да працэсу «дзеля галачкі». Трэба імкнуцца даведацца нейкія цікавыя падрабязнасці, кантэкст падзеі. Напрыклад, было, што сабака скочыў з задняга сядзення на вадзіцеля, і ўсё — аварыя. Альбо людзі ехалі з пахавання і па дарозе таксама траплялі ў аварыю і гінулі — такі вось лёс.

**Мы стараемся не блытаць сенсацыю з эксклюзівам і не пераступаць праз маральныя каштоўнасці дзеля сенсацыі.**

Праца вядучага мае свае цікавыя моманты, але, па сутнасці, ты стаіш у кадры і па-добраму зайздросціш сваім калегам «у полі». Калі ты будзеш рэпарцёрам, то не згубішся, як журналіст. Тандэм у адным чалавеку вядучага і рэпарцёра ў нас практыкуецца на многіх праграмах. І гэта вельмі класна для чалавека, які мае сваю тэму.

**— Ці можна гаварыць аб прафесійным выгаранні?**

— Я не магу сказаць, што стаміўся ад гэтай тэмы, хоць працую ў ёй ужо шэсць гадоў. І кожны раз пры падрыхтоўцы матэрыялу прысутнічае здаровы цынізм. Але разам з тым кожную сітуацыю прапускаеш праз сябе. Ты размаўляеш з роднымі і блізкімі загінулых, асуджаных, і такія моманты цябе загартоўваюць, даюць шанц вытрымаць чужое гора і рухацца далей у працы. Важную ролю адыгрывае акружэнне, у якім ты працуеш. Мне пашчасціла, бо я ў камандзе прафесіяналаў і добрых таварышаў.

**— Што значыць для цябе тэлебачанне сёння?**

— Можа, дзіўна прагучыць, але тэлебачанне — гэта маё жыццё, мая праца і маё ўсё. Нехта можа падумаць, што ў мяне нецікавае жыццё, калі ў ім шмат часу займае праца. Я ж лічу, каб добра рабіць сваю справу — трэба ёю жыць. І быць гатовым аддаваць ёй нават свой вольны час. Мае блізкія не заўсёды задаволены такім раскладам, а сястра наогул жартуе, што мне можна не думаць пра асабістае жыццё, бо я ўжо даўно і надзейна ажаніўся з працай. Але я шчаслівы і кожную раніцу з задавальненнем выходжу з дому і іду туды.

**— У якім ключы хочаш развівацца далей?**

— Хочацца свой праект. Не ведаю, у бліжэйшай будучыні ці ў перспектыве, але спадзяюся, ён будзе. Ёсць нават некаторыя ідэі. Што можа быць лепей, чым сваё дзецішча, зробленае табой ад «а» да «я». І хочацца нарэшце «Тэлевяршыню» атрымаць.

**— Дарэчы, пра «Тэлевяршыню»... Летась ты стаў другім у намінацыі «Лепшы рэпарцёр». Скажы, як жа рабіць праграму «Зона Х» так, каб і гледачы цікавіліся, і прафесійная супольнасць адзначала?**

11.25, 16.25, 19.10 Паляўнічыя на склады.
12.20, 0.55 Top Gear.
14.10, 3.55 Круты цюнінг-2013.
15.05, 6.05 Махінатары.
16.00 Курс экстрэмальнага ваджэння.
17.20, 0.00, 3.05 Ліквідатар.
18.15 Майстры патаргавацца.
21.00 Смяротны ўлоў.
22.00 Войны за малюскаў.
23.00 Дзённікі вялікай вайны.
1.50 Сапраўдныя аферысты.
2.40 Маланкавыя катастрофы.

# ПЧАЛІНАЯ АЎРА... ЛЕЧЫЦЬ

## Усе метады добрыя

**Віктар Яфімавіч СПІРЫДОНАЎ, галоўны ўрач Віцебскага абласнога клінічнага скурна-венералагічнага дыспансера**, заўсёды чамусьці вельмі сціпла расказвае пра навінкі нетрадыцыйных метадаў лячэння. І на гэты раз ён падкрэсліў, што такія метады — толькі дадатковая прапанова, а праблемы са здароўем трэба вырашаць комплексна.



**Карэспандэнт «Звязды» падчас сеансу «пчолатэрапіі».**

— Пагадзіцеся, калі акрамя лекавай тэрапіі чалавеку прапануюць, напрыклад, курс лячэння біяполем пчол, дык няўжо гэта дрэнна? Тым больш што павялічылася колькасць хранічных захворванняў, якія дрэнна паддаюцца лячэнню. Гэта тлумачыцца і тым, што людзі займаюцца самалячэннем, у іх паніжаны імунітэт. Дрэнная экалогія таксама аказвае адмоўны эфект. Сярод іншых вельмі цяжка лечацца псарыяз, нейрадэрміт, экзэма... У сувязі з гэтым нашы медыкі часта прапаноўваюць хворым комплексны падыход. І паралельна з выкарыстаннем высокаэфектыўных медыкаментозных метадаў лячэння, фізіятэрапіі прызначаюцца і нетрадыцыйныя метады. Вельмі добра апраўдалі сябе псіхатэрапія, іголкарэфлексатэрапія, вода- і гразелячэнне, азонатэрапія. Ужо шосты год у нашым дыспансеры выкарыстоўваюцца гірудатэрапія, апітэрапія. Але калі раней мы проста лячылі пчаліным ядам (пчолы джалілі пацыентаў. — **Аўт.**), а таксама — прадуктамі пчалярства, то цяпер пачынаем праводзіць сеансы ўздзеяння на арганізм біяполем пчол, — расказаў галоўны ўрач.

Дамок, дзе пчолы лечаць біяполем, ён упершыню ўбачыў, калі адпачываў з жонкай у Трускаўцы. Там на курорце калегі яму дазволілі вывучыць «пчаліны кабінет», у якім адначасова маглі паправіць здароўе чалавек восем.

— Я і з пчаляром пагутарыў. Дык ён мяне здзівіў тым, што, аказваецца, на пчальніку адмоўная біяэнергетыка, а ў вуллі — дадатная. Ніколі не забуду сваё першае ўражанне ад таго, што адчуў у тым дамку. Пах мёду, воску, пяргі, траў... Тады я загарэўся ідэяй пераняць гэты вопыт, — працягвае Віктар Спірыдонаў.

## І мужчынам дапамогуць «быць на вышыні»

Падчас гутаркі з Віктарам Спірыдонавым і яго калегамі мяне цікавілі падрабязнасці: як гэта дзейнічае?

Афіцыйная навука даўно прызнала тое, што ў савецкія гады ўспрымалася як казка. Прычына многіх захворванняў чалавека — да 85% — крыецца ў біяполі. І праблему можна знайсці, зрабіўшы аўраметрыю — вымярэнне біяполя чалавека. Такую паслугу аказваюць у Мінску. Падчас дыягностыкі можна ў рэальнасці ўбачыць, як выглядае аўра — у выглядзе аўраграмы (пpасторавай трохмернай 3D выявы). А пчолы якраз і станоўча ўплываюць на чалавека сваім біяполем.



**Дамок, дзе лечаць пчолы.**

— Лячэнне біяполем пчол — метад, які выкарыстоўвалі нашы продкі, а яны ж былі не дурнымі людзьмі. Лічу, што трэба вывучаць іх вопыт, бо народныя спосабы лячэння — даступныя і простыя. І яны ніколі не пашкодзяць здароўю, калі, безумоўна, няма супрацьпаказанняў, — дадае галоўны ўрач.

— Гэтым метадам можна вылечыць не толькі дэрматалагічныя, але і ўралагічныя, гінекалагічныя хваробы, захворванні эндакрыннай сістэмы. Добры эфект пры праблемах нервовай і дыхальнай сістэм, пры парушэннях апорна-рухальнага апарата. Лячэнне біяполем пчол устараняе бяссоніцу, нармалізуе патэнцыю ў мужчын. Асабліва карысны сеансы для людзей, якім за 30 гадоў. Метад спрыяе амаладжэнню, з'яўляецца добрым агульнаўмацавальным і аздараўленчым сродкам. Рэкамендаваны курс — 5-10 сеансаў, кожны з якіх працягласцю ад 30 хвілін да гадзіны. Але не ўсім можна будзе паправіць здароўе ў дамку з пчоламі. Табу — для хворых на туберкулёз, анкалагічныя захворванні, у каго алергія на прадукты пчалярства... — растлумачыла **Галіна СЯРЖАНАВА, загадчыца аддзялення медыцынскай рэабілітацыі Віцебскага абласнога клінічнага скурна-венералагічнага дыспансера.**

Паводле яе слоў, дамок спраектаваны такім чынам, што энергетыка пчалінага рою перадаецца чалавеку. Тысячы пчол адначасова лечаць. А цяпло ад дошак у дамку, якія награваюцца ад цяпла пацыента і ад пчол, дае магчымасць расслабіцца мышцам спіны. Пры гэтым паляпшаецца кровазварот... Чалавек атрымлівае мікрамасаж — за кошт вібрацыі, якая ствараецца, калі пчолы рухаюцца.



**Ірма ШАКУНОВА, старшая медсястра аддзялення рэабілітацыі Віцебскага абласнога клінічнага скурна-венералагічнага дыспансера.**

## Ёсць кантакт

Папрасіў галоўнага ўрача, каб кампанію ў падарожжы да «пчалінага царства» мне склала самая прыгожая супрацоўніца. Але ж калі адна прыгажэйшая за другую, дык каго ж «камандзіраваць»? У выніку маім кансультантам і фатографам стала **Ірма ШАКУНОВА, старшая медсястра аддзялення рэабілітацыі.**

— Не трэба хвалявацца: не джаляць у дамку пчолы! — супакоіла яна мяне па дарозе. — Наадварот, зможаце адпачыць, гарантую! Тым больш сёння чарговы спякотны дзень, а ў дамку халаднавата, сонца не пячэ, а які пах: розных траў, мёду, пропалісу! Там жа паралельна і сеанс араматэрапіі атрымаеце.

І вось ён драўляны невялікі цуд-дамок, дзе праводзяць сеансы. Унутры драўляная ляжанка. Пчолы свабодна залятаюць і вылятаюць з дамка. Пры гэтым ад чалавека іх аддзяляе сетка. А каб быў «кантакт з аўрай пчол», на ляжанцы зроблены адтуліны.

— Кладзіцеся і адпачывайце! Так, абутак трэба зняць, але раздзявацца не трэба. Не на агляд жа прыйшлі, — пажартавала медсястра.

Шчыра кажучы, адразу нічога я не адчуў. Мо толькі асалоду ад прыемнага паху і тое, што мне не тэлефануюць. Насамрэч цуд: звычайна турбуюць мяне разоў па пяць-шэсць за гадзіну, а тут мабільны раптам змоўк. Мо пчолы аўрай паўплывалі?

Пачаў прыслухвацца. Пчолы гудуць і гудуць, крыльцамі махаюць (шмат пчол я ўбачыў праз акно дамка. — **Аўт.**). Насякомыя, вядома, не разумеюць, што яны нечакана для сябе сталі лекарамі. А мо і самі нешта адчуваюць, калі чалавек над імі ляжыць? Нездарма ж ёсць выраз: «Пчала — божая істота». Калі ляжаў, успомніў я і словы медыкаў пра тое, што біяполе пчол супадае па частаце ваганняў з біяполем здаровага чалавечага арганізма.

Журналісцкі эксперымент доўжыўся 30 хвілін. Калі ўстаў, адразу адчуў нейкую слабасць. А потым такі прыліў сіл з'явіўся, што не апісаць. Энергіі набраўся ў пчол шмат!

Потым ужо прачытаў, што энергетыка біяполя чалавека пасля лячэння ў дамках павышаецца разоў у пяць. А я ж толькі адзін раз паспрабаваў.

Сеанс абыдзецца пацыентам у 60 тысяч рублёў. Пагадзіцеся, не вельмі дорага. А колькі задавальнення, прыемных эмоцый і ўражанняў, прыбаўкі сіл і аздараўлення! Рэкамендую, не пашкадуеце!

Калектыў дыспансера, упэўнены, яшчэ не раз здзівіць. Калі я пажартаваў наконт змей, прыадкрылі тайну. Мо і смаўжы будуць дапамагаць медыкам. У Еўропе іх выкарыстоўваюць, каб яны маладзілі скуру. А мы ж чым горшыя? Будзе новая нагода напісаць рэпартаж.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

■ Нефармат

# ЛЯСНАЯ Ў ЖАЛОБЕ

**Гэтая рака, якая працякае ў Брэсцкім і Камянецкім раёнах, хварэе. Відаць, так найбольш дакладна можна назваць экалагічную праблему, якая ўзнікла ў выніку ліпеньскіх ліўняў.**



Аказваецца, вясновая паводка — норма, а летняя — амаль што экалагічнае бедства. Дажджы паспрыялі таму, што ўзровень вады ў Лясной падняўся на метр. Рака разлілася, і пад вадой апынулася густая прыбярэжная расліннасць. Пры стойкай тэмпературы ў 33 і больш градусаў цяпла яна пачала гнісці, вада набыла буры колер, за некалькі метраў адчуваецца непрыемны пах. Як вобразна патлумачыў сітуацыю намеснік начальніка аблінспекцыі па ахове жывёльнага і расліннага свету Сяргей Штык, калі ў вазу паставіць кветкі і не мяняць ваду, за некалькі дзён адчуеш смурод, нават пры звычайнай тэмпературы, а не ў спёку. А тут такія маштабы. Названая інспекцыя адной з першых адрэагавала на званкі, якія паступілі з многіх населеных пунктаў: у рэчцы гіне рыба. Сапраўды, у такой вадзе рыба выжыць не магла б. Тыя з насельнікаў ракі, якія здолелі паплыць у чыстыя воды Заходняга Буга, выратаваліся. Шчупакі і плоткі, якіх паводка вынесла з прывычнага рэчышча далей, задыхнуліся ад нястачы кіслароду.

Праўда, за тыдзень-другі пасля паводкі сітуацыя пачала памалу выпраўляцца. Былі адкрыты шлюзы, лішняя вада з Лясной пайшла ў Заходні Буг. Як паведамілі ў абласным камітэце прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, у Камянецкім раёне, у вярхоўі ракі, вада амаль чыстая, смуроду не адчуваецца. Рака паступова сама пачала папраўляцца. Калі ж узровень вады прыйдзе ў норму, сітуацыя канчаткова выправіцца, — перакананы спецыялісты.

Але людзі па-ранейшаму б'юць трывогу, тэлефануюць на розныя «гарачыя лініі». Спачатку мясцовыя жыхары выказвалі думкі, што адбыліся выкіды ў ваду нафтапрадуктаў. Праведзеныя праверкі гэтыя здагадкі абверглі: ніякіх хімічных рэчываў у ваду не трапляла. Але ля адной з вёсак Брэсцкага раёна, дзе стаіць паказальнік «р. Лясная», шыльду нават прыбралі ў чорныя стужкі, тым самым падкрэсліваючы, што рака знаходзіцца ў жалобе, перажывае экалагічную катастрофу. Маладыя людзі казалі, што яны імкнуліся прыцягнуць увагу мясцовай улады да праблемы.

Праблема ёсць. І не ў адной Лясной. Неяк я пісала ў сваёй рубрыцы, што рэкі нашага дзяцінства зарастаюць. І гэта адна з галоўных іх бед. Дарэчы, у 1997 годзе на Лясной была такая летняя паводка з падобнымі наступствамі. У той год вучоныя выпрацавалі рэкамендацыі па аздараўленні воднай артэрыі. Але рэалізацыя праекта вымагала немалых сродкаў. Трэба было правесці даследаванні, заказаць праектна-каштарысную дакументацыю, правесці нятанныя работы па ачыстцы. Тады гэтыя рэкамендацыі пачыталі, ухвалілі і паклалі да лепшых часоў у шуфляды сталоў. Як бачым, лепшыя часы не наступілі, наадварот, здарыўся сусветны эканамічны крызіс, прыспелі іншыя клопаты. Адным словам, рукі да ракі не дайшлі. Хутчэй за ўсё, так будзе і на гэты раз: пагавораць актывісты, пратрубяць СМІ, а потым вада сыдзе, і ўсе забудуцца.

На недахоп сродкаў заўсёды можна спаслацца. Але, думаю, праблема нават не ў ім. Хутчэй, у недахопе нашай агульнай грамадскай свядомасці. Ад мясцовых органаў улады патрабуюць паказчыкаў па надоях, прывагах, уводзе ў строй аб'ектаў, стане дарог і шмат іншага. Яны і стараюцца выконваць прагнозныя паказчыкі. Пра тое, што прыродныя аб'екты — здароўе і дабрабыт нашых будучых пакаленняў, нават думаць не выпадае.

І яшчэ. Не ведаю тых дасціпных маладзёнаў, што павесілі жалобныя стужкі на паказальнік, але вельмі хацела б у іх спытаць, ці згадзіліся б яны папрацаваць летам у свой водпуск ці канікулы на ачыстцы ракі. Баюся, што не шмат знойдзецца такіх добраахвотнікаў. Мяркуючы па беразе той жа Лясной, дзе давялося пабываць крыху больш за тыдзень таму. У ранейшых месяцах адпачынку людзей цяпер нямнога. Амаль ніхто не рызыкуе акунуцца ў брудную ваду. А вось гурбы смецця сустракаюцца — калі не на кожным кроку, то даволі рэгулярна. Дык на каго наракаць? Пакуль не навучымся шанаваць прыроду, пакуль на берагах рэк будзем пакідаць наступствы свайго нецывілізаванага адпачынку, не адчуем, што кожны адказны за раку і возера, дзе быў хоць раз, — нічога не зменіцца з агульнай грамадскай экалагічнай свядомасцю. Да той пары будуць нашы рэкі ў жалобе.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

■ Пытальнік

# АСОБНЫЯ ЗАБАРОНЫ НА ЛОЎЛЮ НЕМЭТАЗГОДНЫ

**Сёлета ўвесну не было разліву рэк. Рыба прыйшла на нераст, а выхаду на лугі няма. Доступ да берагоў свабодны. Рыбу не лавілі, а «душылі», хто колькі хацеў. Тэрмін забароны на яе лоўлю — агульны па ўсёй краіне. А чаму б не ўводзіць гэтую забарону асобна для рэк у пэўнай мясцовасці, улічваючы канкрэтную сітуацыю на месцах?**

**Г. КАЗЛОЎСКІ, г. Рагачоў**

Згодна з новымі Правіламі вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства, якія ўступілі ў сілу з 26 чэрвеня гэтага года, тэрміны забароны зменены і дыферэнцаваны. Веснавая забарона, звязаная з перыядам нерасту ў большасці відаў рыб, у Брэсцкай і Гомельскай абласцях будзе дзейнічаць з 20 сакавіка па 18 мая, у Мінскай, Магілёўскай і Гродзенскай абласцях — з 1 красавіка па 30 мая, у Віцебскай вобласці — з 10 красавіка па 8 чэрвеня.

Апроч гэтага, павялічаны і дыферэнцаваны тэрміны забароны на лоўлю шчупака — з 1 сакавіка па 15 красавіка, а ў Віцебскай вобласці — з 9 сакавіка па 25 красавіка; сома — з 31 мая па 1 ліпеня, з 1 лістапада па 31 сакавіка, а ў Брэсцкай і Гомельскай абласцях — з 19 мая па 20 чэрвеня, з 15 красавіка па 30 мая.

Апроч гэтага, згодна з пунктам 106 Правілаў вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства, у выпадку змянення ўмоў надвор'я, якія ўплываюць на аднаўленне рыбных рэсурсаў, Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя можа прымаць рашэнні аб змяненні тэрмінаў забароны, вызначаных у пунктах 105 і 107 правілаў, як па ўсёй тэрыторыі краіны, так і ў асобных абласцях і раёнах, не змяншаючы пры гэтым агульную працягласць забароны.

Як патлумачылі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, устанаўліваць забароны на лоўлю рыбы падчас яе веснавога нерасту на нейкіх асобных рэках у межах пэўнай невялікай тэрыторыі немэтазгодна




**Яны імкнуцца да прафесіянальнага прызнання і маюць добрыя шанцы дасягнуць яго. Яны вельмі рэалістычныя і адказныя, з'яўляюцца адданымі спадарожнікамі ў жыцці, дзелавымі партнёрамі, бацькамі і сябрамі. У цяжкую хвіліну яны, ацаніўшы ўсе пункты гледжання, прымаюць вельмі цвёрдыя рашэнні, якія часткова або цалкам папраўляюць становішча. Каб быць шчаслівымі, народжаныя ў гэты дзень павінны ўносіць разнастайнасць у сваё паўсядзённае жыццё, ім неабходны актыўны адпачынак разам з усімі членамі сям'і і пастаянныя зносіны з сябрамі.**









## Дурням брытву не даюць

Гэта адбылося ў тыя часы, калі ў вёсках далёка не паўсюль яшчэ спявала радыё, не ўсюды была электрычнасць, калі хлопцы, мужчыны (асабліва зімой) збіраліся ў адной нейкай хаце — да позняй ночы гулялі ў карты, расказвалі анекдоты.

Не кожны гаспадар, а тым больш гаспадыня, можа паважаць падобныя зборышчы, прымаць іх у сябе, але ж людзі такія былі, асобныя нават частавалі ўсіх то печанай бульбай з салёнымі агуркамі, то гарбатай якой... Ды і самі «госці» калі-нікалі прыходзілі з прысмакамі: то халвы хто ў горадзе купіць, то хамсы да бульбы, то цукерак ці абаранкаў... Словам, па-сяброўску людзі жылі, дзяліліся хто чым мог. Але ж аднойчы...

Аднойчы на чарговыя «вячоркі» сабраліся мы да Сцяпана і, трэба ж — унюхалі ў хаце пах дражджэй, згледзелі ў куце вялізную драўляную бочку.

— Каляды хутка, без гарэлкі не абыдзешся, — вінавата прамовіў гаспадар. — Але вы, хлопцы, пра гэта ні слоўца, трымайце языкі за зубамі, бо, не дай Гасподзь, дойдзе да ўчастковага — пасадзіць мяне... Як піць даць!

— Ну што ты, Сцяпане... Мы ж не дурныя, — запэўнілі хлопцы.

— А калі так, то ў гэту нядзелю да мяне не прыходзьце, — распарадзіўся гаспадар, — я гарэлкай буду заняты, а вось па Калядах — ужо калі ласачка. Можаце нават свежыны сваёй прыхапіць... Я — так і быць — гарэлкі пастаўлю. Адзначым свята.

...Час праляцеў хутка, наступаў доўгачаканы збор. Але мне і майму сябруку, які жыў у суседстве, пасвяткаваць з людзьмі зусім не выпадала: не было чаго ўзяць, хоць ты плач: нашы сем'і свежыну да Каляд не рабілі, а пазычаць...

Нашы бацькі, вядома ж, не пайшлі. А вось мы — адважыліся.

Рэч у тым, што гаспадар той хаты, Сцяпан, закалоў свайго парсюка яшчэ на пачатку зімы. У сенях, на ўваходзе ў дом (мы гэта бачылі), ён трымаў кубелец з салам. Там жа, пад самай столлю вісеў шост каўбас. Драбіны, праўда, не было, але ж побач вісела... каса.

Якраз ёю і зрэзалі мы... парачку каўбас.

І вось час вячэры. Яды — як на Дзяды ў нас! Гаспадыня наставіла талерак, нарэзала на іх прынесеных ласункаў: сала, мяса, каўбас, агуркоў, паставіла вялікую міску квашанай капусты з цыбулькай і алеем... Гаспадар таксама парупіўся: у цэнтр стала выставіў вялікую бутэльку, наліў у шклянкі гарэлкі...

Пасля першай тады дружна закусвалі — хто чым. А вось Сцяпан з жонкай дык... сваёй каўбасой.

— А чыя ж гэта, хто прынёс? — пацікавіліся абое. — Вельмі смачна! Амаль па нашым рэцэпце.

Талерку пасля гэткай рэкламы ўмомант размялі...

Потым, пасля бяседы, яшчэ доўга сядзелі — размаўлялі, жартавалі, гулялі ў падкіднога. А калі пад раніцу сталі разыходзіцца, мы з суседам адвялі гаспадара ў бок і ва ўсім прызналіся (бо ўсё роўна ж здагадаецца)... Запэўнілі яшчэ, што «доўг» абавязкова аддамо, як толькі бацькі заколюць свіней.

Сцяпан на нас не сварыўся і, як нам здалося, паверыў. Але ж назаўтра, калі зноў заходзілі да яго ў хату, заўважылі, што кубельца з салам у сенцах няма, шаста з каўбасамі — ужо таксама. Не вісіць на сцяне і каса...

Праўду кажуць: «Дай дурню брытву, то ён і зарэжацца».

Нам да розуму было — як да сонца тады.

**М.П.Багданаў,**

*в. Новы Пагост, Мёрскі раён*

## І ні капейкі больш!

...Цяпер вось як лічаць грошы? Долары — у «штуках» («штука» — тысяча), беларускія рублі — у мільёнах ды мільярдах. А некалі, вельмі даўно, зусім іншая мера была, напэўна, па аналогіі: 60 снапоў — капа, 60 рублёў — таксама...

Дык вось у тыя часы ў маёй роднай вёсцы жыў дзядзька Цімох, якога ўсе звалі Ціма. Быў ён з вельмі беднай сям'і. Дзяцей маці гадавала адна, таму Ціма нідзе не вучыўся. Вырас так. Ажаніўся. Але ж жыць хацеў, як добрыя людзі — па магчымасці заможна. А для гэтага трэ было купіць каня.

Узяўся чалавек зарабляць грошы, балазе, якраз можна было: будаваўся драўляны мост на Тураў (прычым даўжэзны, каля 3 кіламетраў.). Працоўная сіла патрэбна была, а Цімох цягавіты, дужы.

Так што капейка якая-ніякая ў яго сабралася. Запрасіў ён суседа (той больш пісьменны быў) падлічыць яе ды «адмераць», за колькі можна канька прыдбаць.

— Больш за капу плаціць не згаджайся! Які б той конь ні быў! — павучаў сусед.

Ціма запомніў. І якраз жа прачуў, што прадаецца паблізу кабылка.

Была ні была — выправіўся ён паглядзець. Разам з гаспадаром зайшлі ў хлеў — ладная жаробка там, разумная, не старая... Цімоху вельмі спадабалася. Але ж — суседам навучаны — ён адразу спытаў:

— А чаму, дзядзька, прадаяце? Можа, яна ў вас хворая?

— Ды не, браток... Дзеці раз'ехаліся, сам я стары ўжо стаў, не дам рады глядзець, здароўя няма, — прызнаўся гаспадар.

— А колькі ж хочаце грошай? — пытае тады Цімох.

— Пяцьдзясят пяць рублёў.

— Ну што вы... Многа! — не згаджаецца пакупнік.

— Добра, давай 53 — і кабылка твая.

Задумаўся Цімох. Успомніў словы суседа і кажа:

— Даю капу — і па руках! Ні капейкі больш!

— Па руках дык па руках, — усміхнуўся гаспадар жаробкі.

На тым яны і сышліся. Задаволены Цімох конна прыехаў дадому і нават пахваліўся ўсім, як жа выгадна купіў кабылку... Праўда, аднавяскоўцы пасля той пахвальбы яшчэ доўга казалі:

— Таргуйся... Але ж глядзі — не так, як Ціма, купляючы каня.

**Васіль Пяшэвіч,**

*в. Юркевічы, Жыткавіцкі раён.*

## Госць як косць — у горле

...Галава куму балела з раніцы і балела бязбожна. Не тое каб нешта рабіць, нават рухацца было цяжка. А ўсё з-за чаго? Піў напярэдадні.

Колькі — кум узгадаць не мог. Ясна было адно: менш, чым хацеў, але больш, чым мог. Бедны арганізм! Палячыць бы яго хоць чаркай-другой... Толькі дзе ж іх узяць?! Ну хіба да кумы схадзіць? Тая без мужыка жыве, гарэлку заўжды прыпасае, каб нешта па гаспадарцы зрабіць. Раптам нальe?

Роза, убачыўшы госця, тут жа сцяміла, чаго ён прыйшоў. Так і быць: адшкадавала, паставіла на стол бутэльку, прынесла тое-сёе з закускі. Падумала: зараз жа кум палечыцца і, можа, плот ёй паправіць? Альбо дроў пасячэ?

— Роза, ты чалавек! — не пачуўшы гэтых думак і ўліўшы ў горла першую, удзячна прызнаў госць. — Мне ЎЖО лепей!

Хвілін праз колькі яго рука пацягнулася да другой.

— Роза, мне ЯШЧЭ лепей! — пахваліўся ён, каўтануўшы.

І трэцяя чарка таксама не затрымалася:

— Роза, мне ЗУСІМ добра! — вымавіў шчаслівы кум і... ціхенька споўз на падлогу.

**Анатоль Палынскі,**

*г. Беразіно.*

## Усе мы з хат

...Родныя вёскі з сумам пазіраюць, як мы, іх дзеці, разлятаемся па свеце. Што рабіць — вабяць нас незнаёмыя далі, вялікія і малыя гарады: пераязджаем, стараемся ўсё пачаць спачатку, многае адкінуць, забыць.

Я, напрыклад, з усмешкай узгадваю, як саромелася свайго сялянскага паходжання, як пры знаёмствах з хлопцамі выдавала сябе за гарадскую. А калі нехта, чуючы маё вясковае маўленне, у гэтым сумняваўся, — пярэчыла тым, што мы, маўляў, у горад зусім нядаўна пераехалі, але ўсёй сям'ёй...

Не ведаю, колькі б хлусіла яшчэ, колькі б выдавала сябе за «дачку прафесара» (як дзяўчаты з фільма «Масква слязам не верыць»), калі б не выпадак.

Працавала я тады на вялікім хімічным заводзе, у адпачынак з'ездзіла ажно на Каўказ. І вось вяртаюся дамоў, а калі дакладней — еду ў цягніку ў свой горад, у свой рабочы інтэрнат. Еду не адна. У купэ са мной — хлопец. А ўжо ж малады, усмешлівы... Усю дарогу ён забаўляе мяне рознымі размовамі, усю дарогу нечым частуе — шакаладнымі цукеркамі, гарбатай, напіткамі... Мы пазнаёміліся ўжо: ён расказаў, што працуе следчым, што едзе ў мой горад у камандзіроўку, надоўга.

З ім было вельмі весела і вельмі цікава! Ён расказваў пра сваю сям'ю, пра бацькоў, сяброў, пра свой родны Ульянаўск, прыгадваў розныя здарэнні са сваёй практыкі...

Але ж далей болей — стаў ён цікавіцца і маёй персонай. А мяне як чорт тузануў — сказала, што гарадская (у іх, можна падумаць, шанцаў болей?), што жыву з бацькамі ў 4-пакаёвай (!) кватэры. Хлопец было здзівіўся, чаму нас толькі трое ў гэткім палацы? «А ў нас яшчэ бабуля прапісана, але не жыве...» — хлусіла далей я.

І Антона па-ранейшаму «несла»: захацеў праявіць свае аналітычныя здольнасці — «вылічыць» паверх, на якім я жыву, потым спланаваць месцы, дзе мы будзем з ім сустракацца, каб разам схадзіць у Сафійскі сабор, каб потым абысці ў горадзе ўсе кінатэатры...

Я весела падтаквала яму, падыгрывала, згаджалася, а сама хацела скрозь зямлю праваліцца ад сораму! І таму...

На вакзале Антон, можа, на адну хвілiначку адхінуўся, каб здаць у багаж свае рэчы і праводзіць мяне дадому.

Я ў той жа момант, не хаваючы слёз, паімчала на стаянку таксі, а папросту — уцякала ад яго: не хацелася з хлусні пачынаць адносіны. Як і працягваць...

Анікому і ніколі больш я не казала, што нарадзілася ў горадзе.

Іншым таксама хлусіць не раю.

**Т. Раманава**

*г. Наваполацк*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

# ЖЫЦЦЁ ПОЎНАЕ СЮРПРЫЗАЎ...



(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— А калі ў чалавека раптам здарыўся інсульт ці інфаркт? — цікавімся мы.

— Гэта, вядома, стан, які патрабуе аказання хуткай неадкладнай медыцынскай дапамогі, — згаджаецца Святлана Мялюшка. — Дапамога пры гэтым аказваецца ў межах устаноўленай страхавой сумы.

— Але калі гэтай сумы аказваецца недастаткова?

— Тады падключаюцца грошы пацыента. У выпадку, калі і іх не хапае, у аплаце лячэння ўдзельнічаюць сваякі, у якасці пасрэдніка можа быць задзейнічана беларускае консульства — у кожным канкрэтным выпадку рашэнне па гэтым пытанні прымаецца індывідуальна.

У цэлым, калі быць яшчэ больш канкрэтнымі, то, як паведаміла Святлана Мялюшка, часцей за ўсё ўмовы страхавання грамадзян, якія выязджаюць за мяжу, прадугледжваюць аказанне першай неадкладнай медыцынскай дапамогі толькі да зняцця пагрозы жыццю і здароўю, а не поўны курс лячэння падчас знаходжання ў бальніцы. Калі пагрозы жыццю больш не існуе, далейшае лячэнне аплачвае ўжо сам чалавек. Гэта значыць, у выпадку непрыемнасцяў са здароўем пацярпелага прыводзяць у больш-менш нармальны стан, а калі неабходна — эвакуіруюць на радзіму.

Наогул, аперацыі на сэрца, перасадка органаў, лячэнне анкалагічных захворванняў, касметычная і пластычная хірургія, выдаткі па лячэнні хранічных і працяглых захворванняў (тых, што апошнія шэсць месяцаў перад датай страхавання патрабавалі лячэння) таксама не пакрываюцца страхавымі кампаніямі. Практычна ні адна страхавая кампанія таксама не аплачвае лячэнне пашкоджанняў, атрыманых у зоне народных паўстанняў, бунтаў і войнаў. Падрыхтуйцеся да таго, каб аплаціць лячэнне з уласнай кішэні і ў выпадку, калі ў момант атрымання траўмы вы знаходзіліся ў стане алкагольнага ап'янення.

## ВЫКЛЮЧЭННІ І ДАПАЎНЕННІ

Варта таксама звярнуць увагу на тое, што пры афармленні дагавора страхавання для тых, хто едзе за мяжу, поліс амаль заўсёды пачынае сваё дзеянне толькі пасля перасячэння гэтай самай мяжы. Напрыклад, калі дагавор пачынае дзеянне з 15 жніўня і ў гэты ж дзень турыст пашкодзіў нагу на шляху ў Нацыянальны аэрапорт, гэта не будзе лічыцца страхавым выпадкам, паколькі ён яшчэ не перасёк мяжы.

Акрамя агульных для страхавання тыпавых правілаў, у кожнай страхавой кампаніі ёсць свае ўласныя выключэнні і дапаўненні. Напрыклад, ва ўмовах можа быць сказана, што не пакрываюцца выдаткі на лячэнне сонечных апёкаў (выключэнне — калі сонечны апёк здарыўся ў дзіцяці да 16 гадоў) — падобная непрыемнасць лічыцца праявай вашай уласнай бестурботнасці. Страхавая кампанія не будзе дапамагаць вам і ў тым выпадку, калі вы заразіцеся, дапусцім, у Афрыцы інфекцыяй, ад якой можна было зрабіць прышчэпку на радзіме.

## ВАШЫ ДЗЕЯННІ

У выпадку траўмы або хваробы трэба адразу ж звязацца з прадстаўніком страхавой кампаніі за мяжой. Напрамую да дактароў страхоўшчыкі звяртацца не раяць, асабліва ў паўднёвых краінах, такіх як Румынія, Турцыя, Балгарыя, Егіпет — вас могуць пачаць лячыць ад неіснуючых хвароб.

У лёгкіх выпадках вы можаце аплаціць візіт да доктара, рэнтген, набыццё лекаў па прызначэнні доктара самастойна. Пасля вяртання на радзіму трэба будзе падаць усе неабходныя дакументы (медыцынскія даведкі, рэцэпты, рахункі і квітанцыі) страхавой кампаніі, і вам вернуць вашы грошы — калі ваш выпадак будзе прызнаны страхавым. У цяжкіх выпадках адразу ж пасля вашага званка ў страхавую кампанію яна звязваецца з медустановай і сама неадкладна пераводзіць па безнаяўным разліку грошы за лячэнне.

## КОШТ ПЫТАННЯ

Кошт самой страхоўкі для чалавека будзе залежаць ад велічыні страхавой сумы, мэты паездкі, часу, які ён збіраецца правесці за мяжой — тут існуе сістэма павышальных і паніжальных каэфіцыентаў.

Узрост таксама мае значэнне. Так, страхавы поліс на дзіця да 16 гадоў, як правіла, каштуе напалову танней, чым на дарослага. Калі за мяжу выязджаюць бацькі (адзін з бацькоў) або блізкія сваякі (блізкі сваяк) з двума ці больш дзецьмі, пры адначасовым заключэнні дагавора страхавання адно дзіця ва ўзросце да 12 гадоў (уключна) страхуецца бясплатна.

А вось для асоб старэйшых за 65 гадоў ідзе павышальны каэфіцыент, г.зн. страхоўка абыдзецца трохі даражэй. Гэта звязана з тым, што ў пажылых людзей павялічваецца рызыка абвастрэння хранічных захворванняў, а таксама раптоўных хвароб.

— Калі едзе цяжарная жанчына з тэрмінам цяжарнасці звыш 5 месяцаў — мы рэкамендуем страхоўшчыку прымяніць у дачыненні да яе каэфіцыент 1,9. Таму што, калі так здарыцца, што за мяжой у яе народзіцца неданошанае дзіця, мы будзем пакрываць выдаткі на медыцынскую дапамогу і для дзіцяці, — удакладняе наш кансультант.

Што тычыцца мэт паездкі, то ў правілах страхавання ёсць пункт, згодна з якім чалавек павінен паведаміць страхавой кампаніі ўсе істотныя ўмовы сваёй паездкі: чым ён збіраецца займацца — ездзіць на экскурсіі, адпачываць на пляжы, займацца дайвінгам ці, можа, гарналыжным спортам? Калі ён плануе актыўны адпачынак, прымяняецца павышальны каэфіцыент 2,4 — бо актыўныя віды спорту павялічваюць рызыку траўмаў.

Бывалі выпадкі, калі чалавек не паведамляў пра гэта. Ці то забываўся, ці то наўмысна ўтойваў, каб заплаціць за страхоўку менш. У такім выпадку пры атрыманні траўмы страхавая кампанія мае права адмовіцца пакрываць выдаткі. А яны, як правіла, не маленькія.

А цяпер канкрэтна па лічбах. Калі чалавек выязджае ў краіну Шэнгенскага пагаднення, то пасольствы пры адкрыцці візы патрабуюць страхавога пакрыцця са страхавой сумай, якая складае не ніжэй за 30 тысяч еўра. Пры гэтым стандартны кошт страхоўкі на два тыдні, якая пакрывае страхавую суму ў 30 тысяч еўра, — пяць еўра.

«Я б рэкамендавала людзям уважліва чытаць правілы, якія прыкладзены да страхавога поліса, — раіць Святлана Мялюшка. — Там усё прапісана. Агент, які афармляе страхоўку, не заўсёды можа ў поўным аб'ёме распавесці аб умовах страхавання, аб парадку кампенсацыі страхавога выпадку і г.д.

Святлана БУСЬКО.

## Страхоўка ад нявыезду

**У прадчуванні адпачынку вы лічыце дні і гадзіны і раптам... За два дні да паездкі ў вас абвастрэнне язвы або паднялася тэмпература 39 градусаў. А як жа пуцёўка, за якую заплачаны грошы? На гэты выпадак вам могуць прапанаваць адносна новы від страхоўкі — «ад нявыезду».**

Гэта страхаванне выдаткаў грамадзян, якія ўзніклі ў выніку адмены паездкі. Адзіная ўмова — падумаць пра гэта варта загадзя. «Застрахавацца можна не пазней за 2 каляндарныя дні з даты аплаты тура (або яго часткі) або пакупкі квіткоў, браніравання гасцініцы — калі вы едзеце ў адпачынак самастойна», — патлумачыла Святлана Мялюшка.

■ Санкцыі

# РАСІЯ ЗАБАРАНІЛА ПАСТАЎКІ ПРАДУКТАЎ З ШЭРАГУ КРАІН

## Беларусь на гэтым фоне можа атрымаць сваю выгаду

**Урад РФ зацвердзіў пералік замежнай сельгаспрадукцыі, на якую ўводзяцца расійскія санкцыі. Пра гэта паведаміў кіраўнік кабінета міністраў Дзмітрый Мядзведзеў. Пастанова ўрада прадугледжвае поўную забарону на пастаўкі ялавічыны, свініны, мяса птушкі, рыбы, сыроў, малака і пладоваагародніннай прадукцыі ад Аўстраліі, Канады, Нарвегіі, ЗША і краін ЕС на адзін год. Такім чынам, выкананы ўказ прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна ад 6 жніўня «Аб прымяненні асобных спецыяльных эканамічных мер у мэтах забеспячэння бяспекі РФ». Дакумент уводзіць на год абмежаванні на ўвоз у краіну сельгаспрадукцыі дзяржаў, якія падтрымалі антырасійскія санкцыі. Беларусі ўсё гэта можа пайсці на карысць.**



## ПЕРАМОВЫ — НА НАСТУПНЫМ ТЫДНІ

Як стала вядома пасля, Беларусь і Расія збіраюцца абмяркаваць пытанне павелічэння паставак беларускіх прадуктаў харчавання ў Расійскую Федэрацыю ў сувязі з прыняццем РФ указа аб мерах у адказ на санкцыі Захаду. Пра гэта заявіў **міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Леанід ЗАЯЦ** падчас прамой тэлефоннай лініі ў «Сельскай газеце». У прыватнасці, ён паведаміў, што напярэдадні размаўляў па тэлефоне з кіраўніком Рассельгаснагляду Сяргеем Данквертам. «На наступным тыдні ён збіраецца прыехаць у Беларусь для абмеркавання пытанняў, звязаных з пастаўкамі беларускай прадукцыі на расійскі рынак», — сказаў міністр. Ён удакладніў, што Беларусь для сябе ўжо практычна прапрацавала тыя аб'ёмы, якія мяркуецца паставіць сёлета. «У нас ёсць магчымасць значна павялічыць аб'ёмы паставак на расійскі рынак», — лічыць Леанід Заяц. Усю лішнюю прадукцыю, якая выбляецца, краіна гатова пастаўляць усходняй суседцы. «Мы вывучаем нашы магчымасці: чым можам дапоўніць той аб'ём, які быў рэалізаваны летась, за кошт чаго можна пашырыць асартымент, — сказаў міністр. — Думаю, гэта макарона, агародніннная група тавараў, бакалея, кандытарскія вырабы. Зразумела, мяса-малочная прадукцыя, якая даволі шырока прадстаўлена на расійскім рынку сёння».

## ШАНЦ ДЫКТАВАЦЬ СВАЕ ЎМОВЫ

Вось толькі ці будзе гэта «лішняя прадукцыя» ў нашых вытворцаў? І ці не наступіць у нас новы дэфіцыт таго ж мяса ці «малочкі» пасля павелічэння паставак? Кіраўнік Мінсельгасхарча запэўніў, што на ўнутраным рынку гэта ніяк не адаб'ецца. «Сітуацыя на ўнутраным рынку мяса-малочнай прадукцыі ў нас стабілізавалася, таму наша задача заключаецца ў тым, каб павышаць канкурэнтаздольнасць айчыннай прадукцыі, пашыраць яе асартымент і прадстаўляць на знешніх рынках прадукт высокіх спажывецкіх уласцівасцяў», — сказаў міністр.

**Міхаіл КАВАЛЁЎ, дэкан эканамічнага факультэта БДУ, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь,** даў сваю ацэнку падзеі: «Шчыра кажучы, адкрываюцца бліскучыя магчымасці нарошчвання экспарту сельскагаспадарчай прадукцыі ў Расію. Наша суседка штогод імпартуе з Еўрапейскага саюза сельгаспрадукцыю на 7,5 млрд долараў. І на 1,5 млрд — са Злучаных Штатаў. Гэта жывыя грошы, якія мы можам атрымаць. Хаця для гэтага і прыйдзецца, хутчэй за ўсё, напружвацца. Трэба разумець, што калі «заваяваць» рынак зараз, то і пры вяртанні да нармальных умоў мы зможам яго ўтрымліваць. Таму варта напружыцца і ўтрымаць, нават у шкоду сабе. Няхай сёння ёсць шэраг праблем (скарачэнне пагалоўя свіней, зніжэнне вытворчасці малака з-за спякотнага лета і іншыя), з часам мы іх пазбавімся. У пастаўках мясной прадукцыі мы ўвогуле можам пачаць дыктаваць свае ўмовы Расіі — каб яны імпартавалі не толькі тушы, але і гатовую прадукцыю (каўбасы, кансервы і інш.)».

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ ■


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Открытого акционерного общества «Слуцк-Модуль» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже имущества (в комплексе) в составе:**

| № | Наименование | инв. № | Общ. пл., кв.м |
|---|---|---|---|
| 1 | Здание инженерно-бытового корпуса, инв. № 98318 | 640/С-84380 | 10378,5 |
| 2 | Тепловые сети, инв. № 98342 | 640/С-84368 | - |
| 3 | Площадка асфальтобетонная (инв. № 98364) | 640/С-84443 | 1612,5 |
| 4 | Погрузочно-разгрузочная площадка (инв. № 98365) | 640/С-84378 | 783,6 |
| 5 | Трансформаторная подстанция | 640/С-84444 | 37,7 |
| 6 | Сети водопровода (инв. № 98340, инв. № 98339, инв. № 98341) | 640/С-84373 | - |
| 7 | Канализационная насосная станция (инв. № 98330) | 640/С-84377 | 25,2 |
| 8 | Эстакада – площадка для мойки автомобилей | 640/С-84445 | - |
| 9 | Топливно-заправочный пункт (инв. № 98327) | 640/С-84371 | - |
| 10 | Очистные сооружения дождевых стоков (инв. № 98331) | 640/С-84365 | - |
| 11 | Градирня металлическая ККТ-35 (инв. № 25301) | 640/С-84372 | - |
| 12 | Градирня металлическая ККТ-35 (инв. № 25300) | 640/С-84367 | - |
| 13 | Контрольно-пропускной пункт | 640/С-84440 | 8,1 |
| 14 | Склад газовых баллонов | 640/С-84442 | 107,8 |
| 15 | Вспомогательный корпус часть, инв. № 98358 | 640/С-84381 | 1353,6 |
| 16 | Объекты благоустройства | 640/С-84370 | - |
| 17 | Главный корпус, инв. № 98319 | 640/С-84382 | 22590,0 |
| 18 | Здание вспомогательного корпуса, инв. № 98360 | 640/С-51701 | 335,7 |
| 19 | Склад тяжелых металлов | 640/С-39784 | 634,6 |
| 20 | Здание склада | 640/С-38241 | 535,9 |
| 21 | Производственное здание-котельная, инв. № 98361 | 640/С-51700 | 194,3 |
| 22 | Гараж со вспомогательным корпусом | 640/С-47756 | 1362,3 |
| 23 | Здание склада | 640/С-38242 | 2467,1 |
| 24 | Здание информационно-вычислительного центра | 640/С-38243 | 2393,6 |
| 25 | Автомонтажный корпус | 640/С-39783 | 8785,1 |
| 26 | Дренажная насосная станция (инв. № 98329) | 640/С-84375 | 330,6 |
| 27 | Сети канализации (инв. № 98626) | 640/С-84379 | - |
| 28 | Оборудование согласно перечню (перечень находится у организатора аукциона) | | |

Указанные объекты расположены на земельном участке площадью **8,4478 га** (предоставлен на праве постоянного пользования) по адресу: Минская область, Слуцкий район, г. Слуцк, ул. 14 Партизан, д. 101. Земельный участок имеет ограничения в использовании: зона санитарной охраны поверхностных и подземных источников водоснабжения хозяйственно-питьевого назначения на площади 8,4478 га. Имущество сдается в аренду (сведения об арендаторах можно получить у продавца и организатора аукциона).

**Начальная цена снижена на 50% и составляет с НДС – 39 150 542 400 бел. руб. Задаток 5% от начальной цены (1 957 527 120 бел. руб.), перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, УНП 690324015.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Фактические затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Предыдущее извещение о проведении торгов опубликованы в газете «Звязда» от 19.07.2014.

Аукцион состоится **25.08.2014** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **22.08.2014** до 16.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224-61-34, (8029) 102-21-17.**



Открытое акционерное общество

**«Строительный трест № 4»**

**сообщает о проведении Внеочередного собрания акционеров ОАО «Стройтрест №4».**
**Собрание состоится 21 августа 2014 года в 16:00 по адресу: г. Минск, ул. Коммунистическая,17, актовый зал**

**Повестка дня:**
1. О начислении и выплате дивидендов по результатам финансово-хозяйственной деятельности Общества за I полугодие 2014 года.

Регистрация участников собрания проводится с 15.00 до 15.45 по предъявлении паспорта, а представителей акционеров – по предъявлении паспорта и доверенности.

Списки акционеров ОАО «Стройтрест №4» для регистрации участников собрания будут составлены по данным реестра акционеров на 11 августа 2014 года.

Место и время ознакомления акционеров с материалами по вопросу повестки дня собрания: г. Минск, ул. Коммунистическая, 17, рабочие дни с 14 по 20 августа 2014 года с 8.48 до 18.00 (пятница до 17.00) по адресу: г. Минск, ул. Коммунистическая, 17, в день проведения собрания – по месту его проведения с 8.48 до 14.30.

Справки по тел. в г. Минске: 334-10-03.

*Наблюдательный совет*

УНП 100055368



**Куплю любое авто. 8 029 6510099 Велком, 8 029 7918210 МТС**



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Универмаг «Солигорск» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества в составе:**

**Лот № 1:** ЗДАНИЕ МАГАЗИНА, общ. пл. 341,1 кв.м, инв. № 644/С-38264; охранно-пожарная сигнализация (4 единицы); многолетние насаждения (ясень – 2 шт., клен – 2 шт., кустарники живой изгороди, газон).

Указанное имущество расположено на земельном участке с кадастровым номером 643000000001000047 площадью 0,0971 га (предоставлен на праве постоянного пользования) по адресу: Минская область, Солигорский район, г. Солигорск, ул. К. Заслонова, д. 20А.

Начальная цена с НДС – **1 955 990 160** бел. руб. (*стоимость снижена на 10%*). Задаток 10% от начальной цены – 195 599 000 бел. руб.

**Лот № 2:** ДВУХЭТАЖНОЕ КИРПИЧНОЕ ЗДАНИЕ «Дом Семейных Торжеств» с техэтажом, пристройкой, сараем, сараем-холодильником, общей площадью 1160.1 кв.м (инв. № 644/С-39313), расположенного на земельном участке с кадастровым номером 625050100001002584, площадью 0,2678 га (предоставлен на праве постоянного пользования), по адресу: Минская область, г. Солигорск, ул. Железнодорожная, 20 и оборудование: ограждение декоративное, ПКП «Аларм-3 исп.В», барное оборудование, холод. агрегат ВС-200, вешалка гардероб. комплект, мини-диск «Дека», компрессор-кондит. (вент.), торговый павильон, прибор учета теплоэнергии, тестомес ЛН, эл. плита ПЭПК (2 шт.), компрессор L 88 TN к холод. шкафу ШХ-056, холод. шкаф ШХ-056, витрина холодильная, дежа А-2 ХТД нерж., шкаф пекарный ЭШП-3, посудомоечная машина, эл. водонагреватель (3 шт.), стол СМВ-1 (2 шт.), стол СМВ-2 (2 шт.), тележка ТГ-150, распред. пункт ПР-11-30-55 (2 шт.), распред .пункт ПР-11-30-73, распред. пункт ПР-11-30-63, распред. пункт ПР-1-23-55, трансформатор, холодильн. камера УБК, миксер «Воронеж», рукосушитель «Веялис» (2 шт.), холод. камера УБК-9с, компрессор к холод. камере Т6220Е, холод. камера УБК-6м, холод. камера УБК-6с, машина протирочная, стенка Измаил (банкет), холодильная витрина (2 шт.), эл. сковорода СЭСМ 0,5, ледогенератор 20г/с, горка барная, приточная установка (вентиляция), кофемолка FAEMA, компрессор к холод. камере УБК 6с. Условия продажи: сохранение назначения и профиля деятельности объекта в течение пяти лет с момента заключения договора купли-продажи имущества (торговый объект общественного питания).

Начальная цена с НДС – **7 088 022 720** бел. руб. (*стоимость снижена на 20%*). Задаток 5% от начальной цены – 354 401 000 бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 20 (двадцати) рабочих дней после подписания договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **11.09.2014** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **10.09.2014** до 16.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224-61-34, (8029) 102-21-17.**



**ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ**

**по объекту «Многоквартирные жилые дома со встроенно-пристроенными помещениями общественного назначения и подземной гараж-стоянкой на 100 машино-мест в границах ул. Червякова, Каховской, Сморговского тракта» 1-я очередь строительства – жилой дом №1 по генплану»,** ***опубликованную в газете «Звязда» 01 апреля 2014 года:***

**Застройщик**: Общество с ограниченной ответственностью «Фармоэкспотех», зарегистрировано Минским горисполкомом решением от 22 ноября 2007 г. № 2720 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 101472333.

Юридический и почтовый адрес: Республика Беларусь, 220053, г. Минск, переулок Червякова, дом 21А, пом. 5, каб. 3.

**Тел.: 8 (017) 216 00 09, 8 (029)654 10 10, 8(029)708 46 64.**

Режим работы по вопросам долевого строительства: понедельник – пятница с 9.00 до 17.00, обед с 13.00 до 14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, 3-, 4-комнатные квартиры (69 м$^2$ и 84 м$^2$).

Стоимость 1 м$^2$ при условии 100% единовременной оплаты 1500 долларов США, при оплате в рассрочку 1550 долларов США.

УНП 101472333



*Уважаемые акционеры ОАО «Рапс»*

**19 августа 2014 года**
**состоится внеочередное общее собрание акционеров**

**ОАО «Рапс»,**

расположенного по адресу:
Минская обл., Минский район, 223014, аг. Крупица.

*Собрание пройдет по адресу: Минская обл., Минский район, аг. Крупица, ул. Садовая, д. 20, административное здание ОАО «Рапс», первый этаж, актовый зал.*

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:
1. О внесении изменений в условия крупной сделки.

*С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: Минская обл., Минский район, аг. Крупица, ул.Садовая, 20, ОАО «Рапс» (бухгалтерия) с 11 августа по 18 августа 2014 года (время работы с 14.00 до 16.00) либо 19 августа 2014 г. по месту проведения собрания.*

Регистрация участников собрания — с 10.00 до 11.00 по месту проведения собрания.

**Начало работы собрания – 19 августа 2014 г., в 11.00.**

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 13 августа 2014 года.

**Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность, заверенную в установленном порядке!**

*Справки по тел. 8(017)5069211, 8(017)5069341.*

УНП 600068480



**ВНИМАНИЮ АКЦИОНЕРОВ!**

**ОАО «Стройтрест №3 Ордена Октябрьской революции»**

**извещает своих акционеров о проведении «19» августа 2014 года внеочередного собрания акционеров.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**
1. О размере и сроках выплаты дивидендов по итогам работы Общества за 1 полугодие 2014 года.

Собрание состоится по адресу: **г. Солигорск , ул. Козлова, 37, актовый зал (2 этаж) в 17.00.**

С проектом решения собрания акционеры могут ознакомиться по адресу: г. Солигорск, ул. Козлова, 37 в кабинете № 309 с 08 по 18 августа 2014 г. с 10.00 до 16.00 (перерыв на обед – с 13.00 до 14.00), а в день проведения собрания – в актовом зале стройтреста № 3 (2 этаж).

Регистрация участников собрания будет производиться с 16.45 по предъявлению документа, удостоверяющего личность, а для представителей акционеров – по доверенности.

УНН 600122771

***Наблюдательный совет.***



Утерянный представительством Белгосстраха по Первомайскому району г. Минска бланк страхового полиса по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь серии ВА № 0232947 **считать недействительным.** УНП 100122726



**РУПП «ГРОДНОТЕКСТИЛЬ»**
**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА**

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| ЛОТ 1 | |
| Наименование имущества, краткая характеристика | **Автомобиль Citroen C8, кузов № VF7EBRHTB13264558, год выпуска – 2005, инв. № 3875, двигатель дизельный объемом 1997 куб. см.** |
| Начальная цена продажи | 60 917 600 (шестьдесят миллионов девятьсот семнадцать тысяч шестьсот) белорусских рублей без учета НДС |
| Сумма задатка | 6 091 760 (шесть миллионов девяносто одна тысяча семьсот шестьдесят) белорусских рублей |
| Местонахождение имущества | г. Гродно, ул. Горького, 121 |
| Продавец и организатор торгов | Ликвидационная комиссия РУПП «Гроднотекстиль», 230015, г. Гродно, ул. Горького, 121, тел./факс 43-99-64 |
| Условия аукциона | Без условий |
| Условия оплаты | По договоренности сторон |
| Срок заключения договора купли-продажи | не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка | р/с 3012570813012 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500048503. |

**Аукцион состоится 19 августа 2014 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Горького, 91**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в РУПП «Гроднотекстиль» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:
заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;
*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;
*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:
представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;
физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;
представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о первом аукционе было опубликовано 21 мая 2014 года в газете «Звязда».**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Горького, 91 с 9.00 до 17.30.**

**Последний день приема заявлений – 18 августа 2014 г. до 15.00.**

**Телефоны для справок: 43-65-73, 43-02-38.**

